НЕ ЗАДЕРЖИВАЙ ГАЗЕТЫ БОЛЕЕ 1/2 ЧАСА
ПУБЛИЧНАЯ БИБЛИОТЕКА

Пралетарыі ўсіх краін, злучайцеся! | פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַראייניקט זיך | Пролетарии всех стран, соединяйтесь! | Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!

XII ГОД ВЫДАНЬНЯ — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

АЎТОРАК, 7 КРАСАВІКА 1931 г. № 80 (3168)

ОРГАН Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту САВЕТАЎ рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх ДЭПУТАТАЎ і Савету Народных Камісараў Б. С. С. Р

Магутны падважнік калектывізацыі

НОВЫ ЗАКОН ПРА СЕЛЬГАСПАДАТАК НА 1931 ГОД.

Вялізарнейшыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, задачы калектывізацыі сельскай гаспадаркі (у сёлетнім 3-м рашаючым годзе пяцігодкі ня менш 45 проц. сялянскіх гаспадарак па БССР і 50 проц. па СССР) і ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, патрабавалі новых зьмен у сыстэме абкладаньня сельскай гаспадаркі.

Гэтыя зьмены накіраваны на далейшае, яшчэ больш узмоцненае садзейнічаньне калгасам, на максымальны рост вытворчых сіл сельскай гаспадаркі, шляхам хутчэйшай калектывізацыі дробных і драбнейшых сялянскіх гаспадарак і іх тэхнічнага пераўзбраеньня.

Зусім зразумела, што закон пра сельгаспадатак цалкам прыстасаваны да вырашэньня важнейшых задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Задачы замацаваньня існуючых калгасаў і арганізацыі моцнага прыліву новых мільёнаў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы—усё гэта патрабавала пабудовы гэткай сыстэмы абкладаньня, пры якой у шырокіх бядняцка-серадняцкіх масах сялянства былі-б новыя дадатковыя стымулы для ўступленьня ў калгасы, для выкананьня вялізарных заданьняў бягучай вясеньняй кампаніі.

Калгасы сёлета абкладаюцца па іх валавому даходу, вызначанаму на падставе справядлівасьці. Застаўляючы прапарцыянальнае абкладаньне калгасаў, закон устанаўляе розныя стаўкі абкладаньня для асобных форм і відаў калгасаў, больш нізкія для камун і арцеляй і некалькі падвышаныя для прасьцейшых вытворчых аб'яднаньняў-таварыстваў па супольнай апрацоўцы зямлі. Серадняцкія-ж аднаасобныя гаспадаркі абкладаюцца, як і летась, па прагрэсыўнай шкале ставак.

Гэтым самым складаюцца прадпасылкі ня толькі для замацаваньня існуючых калгасаў і арганізацыі новага прыліву ў калгасы, але і для пераходу прасьцейшых вытворчых аб'яднаньняў на статут арцеляй,—гэтай асноўнай формы калгаснага будаўніцтва на даным этапе.

Надзвычайна важны тыя ільготы, якія прадугледжваюцца законам пра сельгаспадатак у адносіне жывёлагадоўлі і тэхнічных культур. Поўнае вызваленьне ад абкладаньня ў калгасах даходаў ад жывёлагадоўлі і надзвычайна палегчанае абкладаньне тэхнічных культур (лёну і канапель), а таксама вызваленьне ад абкладаньня пры росту ў параўнаньні з леташнім пасеўных плошчаў—усё гэта зьяўляецца моцнай зброяй у барацьбе за ўздым і рэканструкцыю жывёлагадоўлі, за пашырэньне базы сыравіны для сацыялістычнай прамысловасьці, за агульнае пашырэньне пасеўнай плошчы.

Закон пра сельгаспадатак улічвае інтарэсы ня толькі калгаснага сялянства, але і тых бядняцка-серадняцкіх пластоў вёскі, якія яшчэ ня ўступілі ў калгасы. Для гэтых груп таксама устаноўлены істотныя ільготы, якія цалкам адказваюць задачам пашырэньня гэтымі гаспадаркамі сваіх пасеваў, разьвіцьця імі жывёлагадоўлі і тэхнічных культур.

У дачыненьні да кулакоў, закон пра сельгаспадатак, як і іншыя мерапрыемствы пралетарскай дзяржавы, зьяўляецца вострай зброяй за поўную ліквідацыю кулацтва на базе суцэльнай калектывізацыі.

З гэткай-жа рашучасьцю, з якой закон падкрэсьлівае недапушчальнасьць абкладаньня ў індывідуальным парадку серадняцкіх гаспадарак, падкрэсьліваецца таксама абсалютная неабходнасьць непаслабнай увагі для індывідуальнага абкладаньня кулацкіх гаспадарак. Ні адзін кулак не павінен выкруціцца ад індывідуальнага абкладаньня. Пры правядзеньні закону пра сельгаспадатак апартуністычна-прымірэнчыя адносіны да кулака павінны быць ліквідаваны. Разам з гэтым ні адна серадняцкая гаспадарка не павінна быць абкладзена ў індывідуальным парадку.

Пастаўленае VI зьездам Саветаў Саюзу ССР перад аднаасобнікам пытаньне:—за ці супроць калгасу—поўнасьцю атрымала свой адбітак у законе пра сельгаспадатак. Сюды трэба аднесьці рашэньне абкладаць частку даходаў серадняков ад продажы сельска-гаспадарчых прадуктаў на прыватным рынку ў тых выпадках, калі ён ня выконвае свае абавязкі па кантрактацыі, па плянавых заданьнях. Калі-ж серадняк выканаў дадзеныя яму плянавыя заданьні па загатоўках і кантрактацыйныя дагаворы, дык даходы ад продажу гэтых прадуктаў на прыватным рынку сельгаспадаткам ня будуць абкладацца. Гэта мерапрыемства, бязумоўна, будзе садзейнічаць выкананьню нашых плянавых загатовак і кантрактацыйных дагавораў.

Некалектывізаваная бедната будзе цалкам альбо часткова вызваляцца ад падатку пастановамі сельскіх і раённых падатковых камісій. Устаноўленыя законам пра сельгаспадатак буйныя ільготы для калгасаў і для бядняцка-серадняцкіх некалектывізаваных гаспадарак павінны быць шырока растлумачаны ўсяму працоўнаму сялянству: калгасьніку і аднаасобніку яшчэ да выхаду ў поле.

Да ажыцьцяўленьня новага закону павінны быць прыцягнуты ўвесь вясковы актыў, уся партыйная і савецкая грамадзкасьць раёну і вёскі.

Раённыя Выканаўчыя Камітэты, раённыя фінансавыя аддзелы і сельскія саветы павінны зараз-жа прыступіць да працы па практычнаму правядзеньні сельгаспадатку і, заручыўшыся дапамогай грамадзкіх арганізацый, павінны мабілізаваць актыў, разгарнуць шырокую агітацыйна-растлумачальную масавую работу.

Цэнтральнаму і мясцоваму друку неабходна разгарнуць на сваіх старонках самую шырокую кампанію па сыстэматычнай папулярызацыі новага закону пра сельска-гаспадарчы падатак.

Неабходна безадкладна прыступіць да распрацоўкі і выданьня пастаноў райвыканкомаў па сельгаспадатку.

Дрэнная арганізацыя працы практычнага правядзеньня сельгаспадатку альбо спазьненьне з правядзеньнем гэтай кампаніі будзе сьведчыць неразуменьне палітычнага значэньня сельгаспадатку,—гэтай моцнай зброі за правядзеньне генэральнай лініі партыі на вёсцы, у справе рэканструкцыі сельскай гаспадаркі на сацыялістычнай базе.

Новы закон пра сельгаспадатак павінен быць ажыцьцяўлены з ўсёй бальшавіцкай паступовасьцю і клясавай чоткасьцю.

А. ХАЦКЕВІЧ.

ПА СССР

Калгаснаму руху—цьвёрдае бальшавіцкае кіраўніцтва

МАСКВА, 6 красавіка. Праўленьне калгасцэнтру СССР дэталёва абмеркавала ход калектывізацыі і падрыхтоўку да веснавой сяўбы па БССР. Адзначана, што ў радзе раёнаў (Гарадокскім, Гомельскім, Рэчыцкім, Віцебскім і Бабруйскім) работа па калектывізацыі разгорнута слаба: процант калектывізаваных гаспадарак ў гэтых раёнах складае 7-10. Шмат якія калгасы Магілеўскага, Дрысенскага і Ветрынскага раёнаў вельмі засьмечаны кулацкім і чужым элемэнтам, якія праводзяць шкодніцкую работу. Заўважаецца значны разрыў паміж колькасьцю аб'яднаных у калгасах, гаспадарак і колькасьцю абагуленай рабочай жывёлы. Ёсьць рад выпадкаў, асабліва ў Сьвіславіцкім, Жыдкавіцкім і Нараўлянскім раёнах, дзе жывёла, інвэнтар і насеньне зусім не абагульваюцца, а таксама не спаганяюцца ўступныя ўзносы.

Кантрактацыя ў БССР выканана ў вельмі нязначных разьмерах, асабліва па лёну і бульбе.

Праўленьне Калгасцэнтру СССР прапанавала Белкалгасцэнтру перагледзіць склад Райкалгассаюзаў Гомельскага, Рэчыцкага, Віцебскага, Бабруйскага, Гарадокскага, Сьвіславіцкага, Жыткавіцкага і Нараўлянскага раёнаў, узмацніўшы іх новымі работнікамі. Белкалгасцэнтру прапанавана таксама перагледзіць сваю работу і пераразьмеркаваць сілы выходзячы з такім разьлікам, каб умацаваць адстаючыя па калектывізацыі раёны. У тых раёнах, дзе ёсьць вялікая засьмечанасьць калгасу кулацкімі і чужымі элемэнтамі, трэба павесьці арганізацыйную растлумачальную работу з мэтай падвышэньня актыўнасьці беднаты, батрацтва і лепшых серадняков, ачысьціўшы калгасы ад кулацкіх і чужых элемэнтаў.

Белкалгасцэнтру даручана ў двухдзённы тэрмін распрацаваць практычныя мерапрыемствы, якія забясьпечвалі-б пляны кантрактацыі лёну, канапель, бульбы і кармовых культур. На сэктар паляводзтва Калгасцэнтру СССР ускладзены абавязак вызначыць кантроль па выкананьні гэтае пастановы.

ЗАЎТРА ТЫРАЖ ПАЗЫКІ „5 у 4"

ЛЕПШЫЯ КАМСОДЫ: Любаньскі, Полацкі, Эльводу, заводу „Камунар", фабрыкі „Камінтэрн", Хізэнскага сельсавету— атрымалі прэміі

АДСТАЮЧЫЯ КАМСОДЫ: Хатаняўскага заводу, фабрыкі „Кастрычнік", заводу імя Варашылава, друкарні імя Сталіна, Аршанскага ільна камбінату і чыгункі— бярэце прыклад з прэміраваных

Усю работу па рэалізацыі пазыкі перавесьці на рэйкі сацспаборніцтва і ўдарніцтва

Лепшыя камсоды прэміяваны

Ад выкананьня фінансавага пляну значна залежыць і выкананьне намечаных плянаў сацыялістычнага будаўніцтва. Вось чаму показ тых камсодаў якія добра праводзяць сваю работу, браць прыклад з гэтых лепшых камсодаў — зьяўляецца нашым абавязкам.

4 красавіка Цэнтральная Конкурсная Камісія па прэміраваньні камсодаў за лепшую работу па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка» і ашчадсправе на сваім паседжаньні прэміравала шэсьць лепшых камісій садзейнічаньня за добрую работу па мабілізацыі сродкаў.

Вось лепшыя камсоды БССР, якія атрымалі прэміі: камсодам Любаньскага і Полацкага раёнаў і камсоду Эльводу (Менск) даны месцы на паездку ў гор. Растоў для ўдзелу ў тыражы пазыкі «Пяцігодка ў 4 гады»; камсоду заводу «Камунар» (Менск) дано адно месца на курот; камсоду Гомельскай швэйнай фабрыкі «Камінтэрн» дана прэмія ў 1.000 рублў; камсоду Хізанскага с.-с. (Веткаўскі раён) дана 250 руб. грашыма.

Чым-жа характарызуецца работа гэтых камісій садзейнічаньня і чаму яны атрымалі прэміі?

Любаньскі камсод выканаў заданьне па мабілізацыі сродкаў на 88,9 пр. Па паасобных галінах плян выкананы: па падатку — 72,3 проц., па пазыцы — 115,3 проц., па мэтавых пазыкавых укладах — 66,6 проц., па ўкладаньнях у ашчадкасу — 96,7 проц., па звароце пазык с.-г. крэдыту — 123,6 проц., мэтавыя ўклады і паі па с.-т. крэдыце — 52,5 проц., уступныя ўзносы па калгассыстэме — 361,3 проц., акцыі Трактарацэнтру — 38,1 проц., паі ў спажывецкую каапэрацыю—43 проц., мэтавыя ўклады ў спажыўкаапэрацыю— 75,7 проц., аднаразовы збор —84,4 проц.

Камісія, якая абсьледвала работу Хізанскага камсоду па мабілізацыі сродкаў канстатуе, што на працягу ўсяго часу гэты камсод «быў сапраўдным органам па арганізацыі справы рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка» і ашчадсправе на тэрыторыі сельсавету».

Па ўсіх вёсках сельсавету праводзілася растлумачальная работа. Вынікам гэтай работы зьявілася тое, што сяляне вёсак Хізы і Гарыстай агульным сходам пастанавілі дабраахвотна набыць аблігацыі пазыкі «Пяцігодка ў чатыры гады», за страхавыя сродкі, якія яны атрымалі за грабіцьце (1.100 руб.). Бядняцка-серадняцкая частка некаторых іншых вёсак шляхам выклікаў на спаборніцтва набыла аблігацыі на суму ў 500 руб.

Пасьля адозвы X Усебеларускага зьезду саветаў аб месячніку ліквідацыі прарываў, Хізанскі сельсавет разгарнуў шырокую масавую работу, каб ліквідаваць усю запазычанасьць па плацяжох.

У выніку на 10 сакавіка сельгаспадатак, самаабкладаньне, страхоўка, культзбор былі выкананы на 100 пр. Цалкам ліквідавана запазычанасьць кулацкіх гаспадарак.

Таксама здавальняюча выканана заданьне па акцыях Трактарацэнтру, па зыцы і ашчадсправе.

Ва ўсіх вёсках сельсавету былі скліканы агульныя сходы, прысьвечаныя мабілізацыі сродкаў, асабліва па пазыцы «Пяцігодка».

Ва ўсіх вёсках працуюць брыгады камсамольцаў і настаўнікаў.

Трэба яшчэ дадаць, што наогул ўся работа па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка» праводзіцца вельмі добра.

Асабліва трэба адзначыць вельмі сумленную, добрую работу па мабілізацыі сродкаў насельніцтва з боку старшыні сельсавету тав. З. Лукомскага. Ён зьяўляецца прыкладам, як трэба змагацца за бальшавіцкія тэмпы і мэтады мабілізацыі сродкаў насельніцтва на будаўніцтва сацыялізму.

Таксама добра працуе камсод Гомельскай швэйнай фабрыкі «Камінтэрн».

Пазыкай «Пяцігодка» ахоплены ўсе 100 проц. рабочых прадпрыемства. Ідзе добра вярбоўка ўкладчыкаў ашчадкасы, на фабрыцы. На сёньняшні дзень 85 проц. рабочых зьяўляюцца ўкладчыкамі ашчадкасы.

У строга добраахвотным індывідуальным парадку праводзіцца папаўненьне ўкладаў шляхам дачы даручэньняў адміністрацыі аб залічэньні ў ашчадкасу на рахунак рабочых з зарплаты пэўнай сумы.

Таксама добра абстаіць справа з мабілізацыяй сродкаў на Менскім заводзе «Камунар», дзе амаль поўнасьцю рэалізавана пазыка «Пяцігодка ў чатыры гады».

Добра абстаіць справа з мабілізацыяй сродкаў і на Эльводзе (Менск). Тут рэалізавана пазыка «Пяцігодка» на 109 проц. На 98 проц. рабочыя ахоплены гэтай кампаніяй.

Ня горш праводзіць работу па мабілізацыі сродкаў і Полацкая камісія садзейнічаньня, дзе таксама добра распаўсюджана пазыка «Пяцігодка».

На прыкладзе работы гэтых камсодаў павінны вучыцца працаваць і іншыя камсоды. Прэміяваньне гэтых камсодаў павінна зьявіцца стымулем, штурхачом па ўзмацненьні работы па мабілізацыі сродкаў, па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка» асабліва зараз, калі 8 красавіка ў Растове пачынаецца тыраж пазыкі «Пяцігодка ў чатыры гады».

Л. Палеес.

Друкарня, раўняйся па Эльводу!

Рэалізацыя пазыкі «Пяцігодка ў чатыры гады» на «Эльводзе» (Менск) прайшла добра. Была праведзена падрыхтоўчая работа па паасобных цэхох. У выніку сярод рабочых і адміністрацыйнага пэрсаналу падпіска праведзена поўнасьцю.

Дадатковая падпіска, якая была праведзена ў адказ на контррэвалюцыйныя вылазкі меншавікоў і «Прампартыі», дала яшчэ 12 проц., што складае ў агульным ліку 102 проц. пляну.

У друкарні імя Сталіна (Менск), маецца вялікі прарыў па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка ў чатыры гады» Вялікая колькасьць рабочых не ахоплена пазыкай. АПО парткалектыву т. Ханіна і старшыня фабкому т. Кагадан тлумачаць гэты прарыў вялікім прытокам новых рабочых у друкарню і іншымі «аб'ектыўнымі» прычынамі, але ні ў якім разе ня хочуць прызнаць сваіх суб,ектыўных прычын.

Брыгада «С.Б.» Назарэнка, ГЭРМАН.

Ажыцьцяўляем сваю пастанову

Вучні і настаўнікі Пагосцкай школы калгаснай моладзі пастанавілі набыць пазыку «Пяцігодка ў чатыры гады» на суму 2.000 руб. Пастанова ажыцьцяўляецца.

Вучань М. Малочка.

Без масавай работы

На Хатаўнянскім вінакурапым заводзе зусім малая колькасьць аблігацый пазыкі «Пяцігодка ў 4 гады» прасунута ў гушчы рабочых.

Маюцца выпадкі, калі адміністрацыя замест таго, каб растлумачыць рабочаму аб значэньні пазыкі, прымусова застаўляе рабочых браць аблігацыі, утрымліваючы з зарплаты вядомую колькасьць грошай.

Трэба адзначыць, што культмасавая работа сярод рабочых у заняпадзе.

В. Рабцаў.

„Савецкая Беларусь" павінна стаць баявой газэтай саветаў рэканструкцыйнага пэрыяду

Пастанова Сакратарыяту ЦК КП(б)Б па агляду ЦО „Праўды" аб газэтах „Савецкай Беларусі" і „Прымежным Калгасьніку"

1) Сакратарыят ЦК КП(б)Б цалкам далучаецца да той ацэнкі газэты «Савецкая Беларусь» і раённай газэты «Прымежны калгасьнік», якая дадзена ў аглядзе друку газэты «Праўда» ад 24 сакавіка 1931 году.

2) Сакратарыят ЦК КП(б)Б абавязвае рэдакцыю газэты «Савецкую Беларусь» і рэдакцыю газэты «Прымежны калгасьнік» зараз-жа перабудаваць сваю работу так, каб забясьпечыць сапраўднае ператварэньне газэты «Савецкая Беларусь» у баявую газэту саветаў рэканструкцыйнага пэрыоду і газэты «Прымежны калгасьнік» у баявую раённую газэту, адпавядаючую патрабаваньням, якія прад'яўляюцца да раёну, як асноўнага зьвяна сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы.

3) Сакратарыят ЦК КП(б)Б зьвяртае ўвагу, як у асаблівасьці рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь», так і ўсяго друку БССР на неабходнасьць самага рашучага і пасьлядоўнага, самага шпаркага разгортваньня «ня ўзіраючы на асобы» пралетарскай самакрытыкі— аднэй з мацнейшых зброй партыі ў барацьбе за сацыялістычнае будаўніцтва.

4) Рэдакцыя газэты «Савецкая Беларусь» павінна забясьпечыць действеннасьць тых матар'ялаў, якія зьмяшчаюцца на старонках газэты, ні ў якім разе не абмяжоўваючыся толькі рэгістрацыяй фактаў і не ператвараючы крытыку ў абязьлічаную і беспрадметную, неабходна «бальшавіцкай самакрытыкай дапамагчы сельсаветам. Але гэтага нельга рабіць, абыходзячы раённае зьвяно. Нельга абыходзіць і цэнтральныя арганізацыі».

Сакратарыят ЦК КП(б)Б ставіць на від рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь» за адзначаныя ў аглядзе «Праўды» недапушчальныя шматлікія факты ператварэньня газэты ў перадатачную дыстанцыю па перасылцы допісаў рабселькораў, замест безадкладнага рэагаваньня на старонках газэты, за няўменьне скарыстаць допісы выкрываючыя праваапартуністычную практыку для палітычнага выхаваньня мас, для скарыстаньня самакрытыкі ў барацьбе за генэральную лінію партыі.

5) Прызнаць работу газэты «Савецкая Беларусь» і «Прымежны калгасьнік» у галіне барацьбы за лён нездавальняючай.

Абавязаць газэты «Савецкая Беларусь» і «Прымежны калгасьнік» і ўвесь друк БССР канцэнтраваць сыстэматычную ўвагу на барацьбе за выкананьне загатовак і пашырэньня пасеўных плошчай лёну, што зьяўляецца аднэй з асноўных і першачарговых задач.

6) Сакратарыят ЦК КП(б)Б у дадатак да раней разасланых раённым газэтам дырэктыў яшчэ раз абавязвае кожную раённую газэту хутчэй перабудаваць усю сваю работу ў суадпаведнасьці з задачаю спэцыялізацыі раёнаў.

7) Праз месяц заслухаць на сакратарыяце ЦК КП(б)Б даклады рэдакцый газэт «Савецкая Беларусь», «Прымежны калгасьнік» і Вушацкага РК КП(б)Б, а таксама садаклад Культпропа ЦК КП(б)Б аб выпраўленьні тых недахопаў і памылак, якія былі адзначаны ў аглядзе ЦО газэты «Правда».

8) Даручыць Культпропу ЦК КП(б)Б разам з фракцыяй ЦВК БССР узмацніць работнікамі газэту «Савецкая Беларусь».

Газэту «Прымежны калгасьнік» узмацніць яшчэ адным работнікам.

ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНА—АСНОВА АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ, ЛЕПШЫ АГІТАТАР ЗА КАЛГАС

Калгасьнікі калгасу „Чырвоны Араты", прыслухайцеся да голасу калгасьнікаў „Кашэўка", „Чырвоны Бераг", „Кастрычнік"

У ІХ уведзена зьдзельшчына, узьняты творчы энтузіязм, узмацняецца гаспадарка, ідзе ўдарная падрыхтоўка да другой бальшавіцкай

У ВАС зьдзельшчына яшчэ ня ўведзена, з 402 працаздольных на работу выходзіць 80 чал., пануе безгаспадарчасьць, няма дысцыпліны, ня выканана будаўнічая праграма

Мы выступаем з фактамі

і заклікаем калгасы перайсьці на зьдзельшчыну

Наладзіць калгасную гаспадарку, дабіцца высокай вытворчасьці працы, падвысіць таварнасьць, зьнішчыць прагулы, наладзіць і добра паставіць вучот працы, палепшыць матар'яльнае становішча калгасьнікаў можна толькі пры поўным ажыцьцяўленьні рашэньняў VI Усесаюзнага Зьезду Саветаў аб пераводзе ўсіх работ у калгасе на зьдзельшчыну, на цьвёрдыя нормы выпрацоўкі.

Нашы калгасы, якія хоць часткова перайшлі на зьдзельшчыну, ужо маюць значныя вынікі.

Калгас «Кушэўка», Аршанскага раёну, зімой перавёў на зьдзельшчыну вывазку гною, высечку і вывазку лесу і догляд за жывёлай. Зьдзельшчына адразу падвысіла прадукцыйнасьць працы.

Да ўвядзеньня зьдзельшчыны брыгада з шасьці чалавек у дзень загатаўляла 10 дрэў, а калі перайшлі на зьдзельшчыну, дык гэтая-ж брыгада стала загатаўляць замест 10 дрэў—36.

Раней брыгада з 6 чалавек вывозіла за дзень 40 вазоў гною, а зараз, пры норме ў 12 вазоў за дзень на чалавека, брыгада вывозіць да 84 вазоў (па 14 вазоў кожны брыгадзір).

Норма для даглядаючых за жывёлай устаноўлена па 15 коней на чалавека. Для догляду за каровамі, якіх калгас мае 40 штук, пастаўлена два мужчыны і чатыры жанчыны. Мужчыны павінны даглядаць за каровамі і чысьціць хлеў, а жанчыны—даіць кароў, даглядаць за цялятамі і сьвінямі.

У Камуне «10-ты Кастрычнік» на зьдзельшчыну пераведзены ўсе надворныя работы: кузьня, возка і рубка дроў, ачыстка насеньня і догляд за жывёлай. Тут таксама зьдзельшчына дала па ўсіх галінах работ значныя дасягненьні. Калі раней брыгада з трох чалавек за дзень ачышчала ня больш 14 цэнтнэраў збожжа, дык зараз пры норме ў 16 цэнтнэраў на дзень, гэтая-ж брыгада ачышчае ўжо да 24 цэнтнэраў. Вывазка гною раней, да зьдзельшчыны, давала ня больш 15 вазоў за дзень на аднаго работніка, а зараз, пры норме ў 20 вазоў на работніка, вывозіцца тым-жа работнікам па 23 вазы і нават больш за за дзень.

На адну жанчыну прыпадае па 12 кароў, якіх яна павінна падаіць і пакарміць. Таксама адна жанчына па норме павінна даглядзець 20 дарослых сьвіней, або 30 подсьвінкаў, або 50 парасят. За дзесяцю конямі даглядае адзін чалавек.

У калгасе «Чырвоны Бераг» пераведзены на зьдзельшчыну яшчэ толькі парніковыя работы, але і гэта ўжо дало добрыя вынікі.

Мы заклікаем усе калгасы, як мага хутчэй, перайсьці на зьдзельшчыну, ліквідаваўшы адначасна абязьлічку, каб выйсьці ў поле з цьвёрдымі нормамі выпрацоўкі.

Пераход на зьдзельшчыну і ліквідацыя абязьлічкі ў калгасах забясьпечыць разгортваньне калгаснага руху на вёсцы.

Старшыня праўленьня калгасу «Кушэўка» Шаляшынскі.
Старшыня праўленьня калгасу «Чырвоны Бераг» Міронччык.
Старшыня камуны «10-ты Кастрычнік» Стаховіч.

Зьдзельшчына—магутны ўдар па кулаку і яго агентах

Зьдзельшчына ў Чарэйскім р. да гэтага часу яшчэ не практыкавалася. Аднак, цяпер, пры шырокім растлумачэньні прынцыпаў зьдзельшчыны сярод калгасьнікаў, мы бачым, што калгасы ахвотна пераходзяць на новыя правільныя мэтады арганізацыі працы.

У сувязі з увядзеньнем зьдзельшчыны ў працы калгасаў, у перадсьмяротных спазмах заварушыліся кулакі, кулацкія падпявалы і гультаі, якія ня хочуць працаваць самі, а імкнуцца крывавожорна цягнуць сокі з другога.

Праводзячы падрыхтоўку да сяўбы ў лютым змаганьні супроць кулака, правільна арганізуючы працу ў калгасах на аснове зьдзельшчыны, якая зьяўляецца галоўным зьвяном падрыхтоўкі да вясеньняй пасеўкампаніі,—калгасы Чарэйшчыны гэтым самым выконваюць задачы, ускладзеныя на іх партыяй і ўрадам.

Латкоў К.

10 калгасаў Бялынічшчыны перайшлі на зьдзельшчыну

Да гэтага году ў калгасах Бялыніцкага раёну зьдзельшчына зусім ня ўжывалася і толькі пасьля вынікаў першага гаспадарчага году на заклік партыі і ўраду аб увядзеньні зьдзельшчыны, ў ажыцьцяўленьне пастаноў VI Усесаюзнага зьезду саветаў аб калгасным будаўніцтве—усе калгасьнікі адгукнуліся на гэтую справу, зразумеўшы ўсю карыснасьць правільнай арганізацыі працы.

3-га красавіка на нарадзе старшынь калгасаў былі абгаворавы прыкладныя нормы выпрацоўкі і прынцыпы ўвядзеньня зьдзельшчыны.

На сёньняшні дзень ужо 10 калгасаў раёну перайшлі на зьдзельшчыну, якая зьяўляецца адзіным правільным спосабам арганізацыі працы.

Калгасы Бялынічшчыны ўпарта змагаюцца супроць гэтых кулацкіх настрояў, даючы ім рашучы адпор.

Маліноўскі Н.

Увядзеньнем зьдзельшчыны

аздаровім калгас, выведзем кулацкіх агентаў на чыстую ваду

Калгас «Чырвоны Перадавік» Прапойскага раёну добра спраўляецца з выкананьнем загатовак бульбы, лёну і інш. ярыны. Разам з тым калгас забясьпечан прадуктамі харчаваньня лепш, чымся аднаасобныя гаспадаркі. Калгас мае моцную гаспадарку.

Але поруч з гэтым калгас на сёньняшні дзень не пазбавіўся яшчэ некаторых хваробных зьявішч.

Самае галоўнае гэта тое, што дагэтуль няма адзінай ўстаноўкі аплаты працы калгасьнікаў па аддзяленьнях (калгас складаецца з трох аддзяленьняў). Напрыклад: у аддзяленьнях Лапацуеўка і Каменка расцэнка працы калгасьнікаў робіцца за выхады на працу, ня ўлічваючы колькасьці гадзін працы, а ў аддзяленьні Папараткі праца ўлічваецца па гадзінах. Гэта выклікае незадаволеньне паміж калгасьнікамі паасобных аддзяленьняў.

Апроч таго, няма яшчэ належнага вучоту ўраджаю і аховы яго. Часта прадукты і фураж расьцягваюцца невядома кім і куды. Кулацкая маёмасьць, перададзеная калгасу, разбазарваецца.

Старшыню калгасу Новікава Грышку нельга пахваліць за яго паводзіны, як камуніста; ён першы дае прыклад разбазарваньня жывёлы: парэзаў ўсіх сваіх авечак.

Усё гэта скарыстоўвае клясавы вораг у барацьбе супроць калектывізацыі.

Трэба ў першую чаргу ачысьціць калгас ад падобных хваробных зьявішч, каб паставіць калгас на шлях шпаркага росту.

Клясавага ворага трэба рашуча вымесьці, з калгасу, каб ён сваёй подлай агітацыяй не перашкаджаў будаваць сацыялістычную гаспадарку. Поруч з гэтым трэба неадкладна ўзяцца за арганізацыю працы ў калгасе, наладзіць правільны вучот яе, устанавіць зьдзельную расцэнку працы, што дасьць правільнае, а ня кулацка-ядоцкае, разьмеркаваньне ўраджаю, зьнішчыць усякія нараканьні і спрэчкі паміж калгасьнікамі.

Адзіны спосаб правільнай арганізацыі працы — зьдзельшчына. Пры зьдзельшчыне кожны калгасьнік зацікаўлен ня толькі ў уласнай выпрацоўцы, але і ў агульным даходзе калгасу, кожны сачыць за сабою і за іншымі, кожны імкнецца да большай эфэктыўнасьці працы.

Зьдзельшчына ўзьнімае як матар'яльнае становішча калгасу, так і аўтарытэт яго сярод ваколічных бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, якія ахвотна ідуць у калгас, даючы гэтым апошні руйнуючы ўдар па кулаку і яго агентах.

Камсамолец.

„Чырвоны Араты" яшчэ ня мае зьдзельшчыны

Калгас разьядаюць—безгаспадарчасьць, недысцыплінаванасьць, падушна-ядоцкія настроі, кулацкая агітацыя

Калгас «Чырвоны Араты», Камарынскага раёну, арганізаваўся год назад. 96 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, ня гледзячы на шалёную агітацыю клясавага ворага—кулака, аб'ядналіся ў калгас.

Першы гаспадарчы год паказаў значную перавагу буйнай калектыўнай гаспадаркі над аднаасобнай. Калгасьнікі ў выніку разьмеркаваньня ўраджаю атрымалі ў параўнаньні з работай ў сваёй аднаасобнай гаспадарцы прыбытак у некалькі разоў большым.

Паказ вялізарных дасягненьняў калгасу перад аднаасобнікамі, шырокая растлумачальная работа, уцягнулі яшчэ 83 новых бядняцка-серадняцкіх гаспадаркі ў калгасы. Зараз калгас аб'ядноўвае 179 гаспадарак, што складае 54 проц. калектывізаваных гаспадарак сельсавету, і зьяўляецца адным з буйнейшых калгасаў у раёне.

Але поруч з гэтымі дасягненьнямі маецца цэлы рад недахопаў.

Калгас мае жывёлагадоўчы напрамак, аднак, з 118 штук буйнай рагатай жывёлы калгасьнікаў, абагулена толькі 38, (рэшта атрымана ў парадку камплектаваньня). Кулак разбазарваючы сваю жывёлу, агітаваў на гэта і калгасьнікаў. Мясцовыя савецка-каапэрацыйныя арганізацыі не змаглі шляхам рашучай барацьбы спыніць разбазарваньне жывёлы калгасьнікамі, якая падлягала абагуленьню.

Спажывецкія настроі калгасьнікаў не знайшлі належнага адпору з боку парт'ячэйкі, сельсавету і праўленьня калгасаў. Агідны факт: з 75 кароў, якія даюць у сярэднім каля 400 літраў малака ў дзень пры наяўнасьці добра абсталяванай малочнай фэрмы, калгас за апошнія месяцы ня зьбіў ніводнага кілёграма масла; прычына гэтага—раздача малака калгасьнікам у той час, калі кожны калгасьнік мае па карове.

Безгаспадарчыя адносіны калгасьнікаў да маемасьці, адсутнасьць арганізацыі працы—зьяўляюцца горшымі ворагамі калгасу; супроць гэтых зьявішчаў ніякай барацьбы не праводзіцца.

На 1930 г. прадугледжана было набудаваць у калгасе сьвінарнік, але плян гэты быў сарваны. Ёсьць пагроза зрыву пляну будаўніцтва на 1931 год, якім прадугледжаны пабудаваньне сьвінарніка, кароўніка, канюшні і іншых гаспадарчых будынкаў. Тлумачыцца гэта тым, што да вывазкі лесаматар'ялаў, адпушчаных калгасу ў колькасьці 1132 куб. мэтр., калгас прыступіў толькі ў сакавіку і вывезена ўсяго каля 200 куб. мэтр. Гэта ў той час, калі ў калгасе маецца 127 рабочых коняй.

Арганізацыя працы ў калгасе не наладжана. З колькасьці 402 працаздольных калгасьнікаў на рабоце скарыстоўваецца 50-80 чал. Гэта сьведчыць аб няўменьні правільна арганізаваць і поўнасьцю скарыстаць наяўную працоўную сілу ў калгасе.

Калгас прыняў плян веснавой сяўбы ў 500 га; значнае павялічэньне плошчы прыпадае на тэхнічныя культуры бульбы і траў. Але падрыхтоўка да веснавой пасеўнай кампаніі не разгорнута, інвэнтар і збруя не адрамантаваны, адсутнічае патрэбны матар'ял для рамонту. Ня гледзячы на тое, што ў калгасе не хапае насеньня тэхнічных культур і бульбы 1225 цэнт., калгас ня толькі ня прыступіў да мабілізацыі ўнутраных насенных рэсурсаў, а нават да гэтага часу не дабіўся абагуленьня насеньня новаўступіўшых калгасьнікаў. Такім чынам калгас ня рыхтуецца як сьлед да сяўбы. Самацёк, жаданьне адкласьці ўсю падрыхтоўчую работу да самага пачатку сяўбы зьяўляецца галоўнай прычынай у гэтым.

Каб пазбавіцца ад усіх гэтых недахопаў, калгасу трэба ў першую чаргу правільна наладзіць усю сваю працу. Час адмовіцца ад нерацыянальнага скарыстаньня працоўнай сілы, ад безгаспадарчасьці. Трэба неадкладна, насуперакор кулацкай агітацыі, пераключыцца на зьдзельшчыну, якая зьяўляецца адзіным правільным спосабам арганізацыі працы.

М.

Апэрацыйная сводка другой бальшавіцкай

Сталёвая коньніца перад выхадам у поле

Паводле даных Беларускага аддзяленьня Трактарацэнтру на 31 сакавіка ўсімі машына-трактарнымі станцыямі БССР заключаны дагавары з 1061 калгасам. За апошнюю дэкаду сакавіка МТС заключылі дагаворы ўсяго толькі з 45 калгасамі.

Дагаворамі ахоплена плошча пасеву ў 174.636 га супроць 171.178 га на 20 сакавіка, што складае 79,2 проц. пляну.

За апошнюю дэкаду сакавіка сіламі МТС арганізавана ўсяго 23 новых калгасы. Гэты факт больш чым яскрава сьведчыць аб апартуністычнай недаацэнцы з боку асобных мясцовых арганізацый і саміх работнікаў асобных МТС ролі і значэньня машынна-трактарных станцый у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Да выхаду ў поле засталіся лічаныя дні. Усе сілы і ўся энэргія работнікаў МТС і мясцовых арганізацый павінна быць накіравана на поўнае колькаснае і якаснае выкананьне плянаў нашымі машына-трактарнымі станцыямі.

ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ У ЦІСКОХ ФАШЫСЦКАГА ТЭРОРУ

Масавымі арыштамі, дзікімі катаваньнямі ў засьценках дыфэнзывы, разгулам карных экспэдыцый польскі імпэрыялізм са сваёй агэнтурай—заходня-беларускімі нацыянал-фашыстымі,

ІМКНЕЦЦА: у крыві мільёнаў працоўных затапіць рэвалюцыйны рух на Зах. Беларусі і Зах. Украіне, падрыхтаваць тыл і гарматнае мяса для ўзброенай авантуры супроць СССР.

Маскі скінуты

У сударагах жорсткага эканамічнага крызісу вось ужо два гады курчыцца фашысцкая Польшча. Сусьветны крызіс капіталізму б'е з найбольшай сілай па гаспадарчым арганізьме капіталістычнай Польшчы. Таму паралічу, які ахапіў эканамічнае жыцьцё Польшчы ня відаць канца. Тут у Польшчы, на гэтым найбольш паслабленым вучастку сусьветнай капіталістычнай сыстэмы з найбольшай вострасьцю праяўляецца ўся тая сума супярэчнасьцяй, у якой бездапаможна барахтаецца капіталізм.

Але калі ўся Польшча надзвычайна хваравіта перажывае параліч сусьветнай капіталістычнай сыстэмы, дык на Заходняй Беларусі крызіс капіталізму, памножаны на ваенна-авантурную палітыку фашысцкай дыктатуры, дае сябе адчуваць з асаблівай сілай. Трэба памятаць, што, напрыклад, ўзровень разьвіцьця прамысловасьці Заходняй Беларусі нават у самыя лепшыя часы для Польшчы ніколі не дасягаў узроўню даваеннага разьвіцьця. А зараз **у Заходняй Беларусі**, па прызнаньні саміх пілсудчыкаў, разьвіваецца **сапраўдная катастрофа.** Калі ў карэнных ваяводзтвах Польшчы на кожную сотню працуючых прыпадае 77 непрацуючых, дык у Заходняй Беларусі на кожную сотню працуючых прыпадае 104 непрацуючых. У Заходняй Беларусі беспрацоўе дасягнула нячуваных разьмераў—звыш 100 тысяч чалавек выкінуты на брук, аказаліся непатрэбнымі, лішнімі...

Прамысловасьць Заходняй Беларусі ледзь дыхае. Беласток фактычна замёр; толькі дзьве тэкстыльныя фабрыкі—фабрыкі Шапіра і Готліб працуюць з поўнай нагрузкай, выконваючы ваенныя заказы фашысцкай дзяржавы. У скураной, будаўнічай, шкляной і дрэваапрацоўчай прамысловасьці колькасьць рабочых паменшылася на палову і нават больш. **Велізарная рэзэрвная армія пралетарыяту пазбаўлена ня толькі хлеба і прытулку, але нават надзей на палепшаньне свайго становішча ў рамках капіталістычнай сыстэмы гаспадаркі.**

Побач з нячуваным ростам беспрацоўя, ідзе катастрафічнае зьніжэньне матэр'яльнага ўзроўню рабочых мас. Шалёнае наступленьне буржуазіі на рабочыя масы знайшло свой яскравы адбітак хоць-бы ў тым факце, што ня гледзячы на агульны рост дарагоўлі ў Польшчы, **заработак рабочых у прамысловасьці Заходняй Беларусі за 1930 год у сярэднім зьніжаны,** паводле афіцыйных даных, **на 25 проц.**

Прамысловы крызіс польскага капіталізму самым цесным чынам пераплёўся з сельска-гаспадарчым крызісам. Працэс разарэньня асноўных мас сялянства ў Заходняй Беларусі ідзе, ня спыняючыся. Гэта знашло яскравы адбітак у тым факце, што 30 проц. усіх сялянскіх гаспадарак Заходняй Беларусі маюць надзелы зямлі да 2 га, а 39 проц. гаспадарак уладаюць надзелам ад 2 да 5 га. Зусім зразумела, што працэс разарэньня вёскі ні ў якай меры не закрануў кулацкае верхавіны. Наадварот, **уся палітыка польскага фашызму з яе сыстэмай земляўпарадкаваньня** (камасацыя) **і парцэляцыі накіравана на ўзмацненьне кулацтва, гэтага фундаманту і сацыяльнай базы фашызму на Заходняй Беларусі.** Адначасова з узмацненьнем кулацтва ішоў працэс насаджэньня асаднікаў. Толькі да 1925 году асаднікам было перадана 150 тысяч га зямлі, прычым працэс насаджэньня асадніцтва працягваецца і зараз.

Аграрны крызіс на Заходняй Беларусі ўзмацняецца, будучы памножаны на жорсткую падатковую палітыку, палітыку штрафаў, шарваркаў і г. д.

Але наступленьне фашызму натыкаецца на контр-наступленьне рабочае клясы і працоўных мас сялянства. На агульным фоне жорсткага прамысловага і аграрнага крызісу, на фоне жудаснага белага тэрору **разгортваецца нястрымана рэвалюцыйны ўздым. Заходняя Беларусь уступіла ў пэрыяд новага рэвалюцыйнага ўздыму,—гэта тое новае, што становіцца зараз відавочным кожнаму, тое новае, што неабходна ўлічваць пры агульнай ацэнцы становішча Польшчы і Заходняй Беларусі.**

На самой справе, возьмем забастовачную барацьбу. З 20 буйных забастовак, меўшых месца на Заходняй Беларусі за 1930 год, толькі дзьве забастоўкі насілі абарончы характар, астатнія-ж 18 мелі ярка выяўлены палітычна-наступальны характар. Так, напрыклад, зусім нядаўна ў Беластоку адбылася забастоўка 1.500 рабочых пад лёзунгамі абароны палітвязьняў.

Вельмі паказальны для агульнага росту рэвалюцыйнага ўздыму **адзіны фронт барацьбы працуючых і беспрацоўных мас.** Так, у Кобрыне мела месца дэманстрацыя 1.400 рабочых, батракоў і сялян, выступіўшых у міжнародны дзень барацьбы з беспрацоўем пад лёзунгамі «работы і хлеба». Пачасьціліся факты актыўнай абароны дэманстрантамі камуністычных прамоўцаў. У радзе месц дэманстранты проста адбівалі ў паліцыі арыштаваных. У радзе пунктаў барацьба прыняла настолькі жорсткі характар, што паліцыя ўласнымі сіламі аказалася ня ў стане справіцца з дэманстрантамі. Так, у Граеве паліцыя вымушана была зьвярнуцца да ўланскага палка за дапамогаю. Але... полк аказаўся ненадзейным і Граеўскаму магістрату прышлося пайсьці на уступкі, прышлося выдаць беспрацоўным невялікую часовую дапамогу.

Мы падалі толькі некалькі фактаў, якія сьведчаць аб наступальным характары рабочых выступленьняў. Трэба ўлічыць, што барацьба пралетарыяту Заходняй Беларусі, у сувязі з надыходам вясеньніх палявых работ, прыме больш шырокія разьмеры. **У барацьбу ўступіць вялікі атрад сельска-гаспадарчага пралетарыяту,** які ўжо ў мінулым годзе на радзе сутычак з кулакамі, памешчыкамі і фашысцкай дзяржаўнасьцю паказаў сваю палітычную цьвёрдасьць, свае здольнасьці ня толькі абараняецца супроць прыгнечаньня і эксплёатацыі, але і наступаць.

Абвастрэньне рэвалюцыйнай барацьбы мы бачым і ў сялянскіх масах. У заходня-беларускай вёсцы рэвалюцыйная барацьба разгортваецца ў першую чаргу пад сьцягам анты-падатковых выступленьняў. Лёзунг кампартыі ЗБ **«ні граша падаткаў фашысцкаму ўраду»** у многіх раёнах, дзе сялянскія масы аказаліся гатовымі да барацьбы, ператварыўся ў лёзунг актыўнага дзеяньня. Так, у радзе вёсак і гмін Брэскага, Баранавіцкага і Віленскага паветаў меў месца просты адказ ад плацяжу падаткаў.

Побач з гэтым, разгортваецца барацьба супроць шарваркавых работ, супроць сапраўды прымусовых работ, якія арганізуе фашысцкая дыктатура для ваенных мэтаў. Вось характэрны факт: у парадку шарваркавых работ у вёсцы Алясевічы, Баранавіцкага павету, мясцовая ўлада пабудавала мост, прычым на сялянства было ўскладзена задача ахоўваць мост і яго рамантаваць. Сяляне спалілі гэты мост, а калі зьявілася паліцыя, натоўп разброіў яе, арыштаваў паліцыянтаў, а разам з імі і солтыса. Новаму ўзмоцненаму атраду паліцыі прышлося некалькі гадзін змагацца з паўстаўшым сялянствам, раней чым ёй удалося выратаваць арыштаваных. Прычым цікавы вось які момант: **сялянства не выдала зачыншчыкаў.** Гэты факт досыць яскрава кажа, што барацьба сялянства накіравана ня толькі супроць асаднікаў, памешчыкаў, кулакоў, але і супроць самой фашысцкай дыктатуры.

У радзе вёсак мелі месца факты вызваленьня сялянскімі масамі арыштаваных. Усё гэта сьведчыць аб палітычным характары барацьбы працоўных мас вёскі.

І так. Мы бачым у Заходняй Беларусі рэзкае абвастрэньне клясавай барацьбы, новы ўздым рэвалюцыйнай хвалі, мы бачым пераход рабочае клясы і працоўных мас сялянства ў наступленьне на капіталістаў і памешчыкаў, на асаднікаў і кулакоў, на ўсю сыстэму польскага фашызму, арганізаванага ў дзяржаўную ўладу.

На чале гэтай барацьбы з польскім фашызмам ідзе кампартыя Заходняй Беларусі—адзін з лепшых і надзейных атрадаў кампартыі Польшчы і Камінтэрну.

***

На агульным фоне новага рэвалюцыйнага ўздыму ў Польшчы і Заходняй Беларусі ярка вызначаецца **ідучы працэс далейшае кансалідацыі нацыянальна-вызваленчага руху.** Ні палітыкай актыўнага белага тэрору, ні фальшывымі манэўрамі, ні подкупам, ні сіламі нацыянал-фашыстаў ня ўдалася пілсудчыкам разьбіць нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі. Працэс кансалідацыі нацыянальна-вызваленчага руху ідзе ў абставінах клясавых боек.

Нацыянальная палітыка фашысцкага ўраду, якая цалкам носіць ярка выяўлены анты-савецкі характар, накіравана тое, каб разгарнуць наступленьне на рабочую клясу і масы працоўнага сялянства, каб разьбіць новы ўздым рэвалюцыйнага руху, каб закончыць падрыхтоўку да інтэрвэнцыі супроць СССР. У гэтай барацьбе польскага фашызму за ператварэньне Заходняй Беларусі ў абаронены тыл сваёй інтэрвэнцкай арміі пілсудчыкам актыўна дапамагаюць з усіх сіл нацыянал-фашысты—Астроўскія і Луцкевічы, тэтыя выкрытыя агенты польскай ахранкі.

Мы бачылі атакі нацыянал-фашыстаў на легальныя арганізацыі нацыянал вызваленчага руху, атакі, накіраваныя на тое, каб разграміць гэтыя арганізацыі, дэзарыентаваць гэты рух, каб кіраўніцтва рухам часткаю падкупіць, а часткаю зьнішчыць. Разгром «Змаганьня», удары па «Т-ву Беларускай Школы»—усё гэта зьвеньні аднаго і таго-ж ланцугу.

Але спробы гэтыя ня скончыліся з посьпехам. Той факт, што нацыянал-фашысцкая зграя на апошніх выбарах у сойм, ня гледзячы на тое, што яна па сутнасьці мела манаполію на друк, ня гледзячы на сродкі, адпушчаныя ёй другім аддзелам генштабу, атрымала ўсяго толькі 10 тысяч галасоў—**гэты факт сьведчыць аб поўным банкруцтве спробаў нацыянал-фашыстаў падпарадкаваць сабе масавы нацыянал-вызваленчы рух.** Толькі у адным месцы і тое на кароткі адрэзак часу фашысты атрымалі перамогу. Але гэта была Пірава перамога. Ім удалося ўзяць пад свае кіраўніцтва Беластацкую ўправу «Т-ва Беларускай школы», але ўжо першыя выбары, якія прынесьлі поўны разгром здрадніцкага кіраўніцтва, паказалі, што і тут масы добра раскусілі нацыянал-фашысцкі гарэх, што масы, ідучыя пад лёзунгам нацыянал-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, адвярнуліся ад дэфэнзыўшчыкаў Астроўскіх і Луцкевічаў.

Той факт, што нацыянал-фашысты страцілі ўплыў у беларускіх працоўных масах, **што гэтыя масы ня з імі, а супроць іх,** што адзінай апорай нацыянал-фашызму зьяўляецца беларускае кулацтва і верхавіна беларускай інтэлігенцыі—гэты факт прымусіў нацыянал-фашыстаў перагледзіць сваю тактыку. Нацыянал-фашысты зараз сталі на шлях адкрытага супрацоўніцтва з польскім фашызмам. Маскі зараз скінуты. Зараз нацыянал-фашыстам няма чаго утойваць сваю непасрэдную сувязь з польскай дэфэнзывай і з генэральным штабам. Зараз няма сэнсу гуляць у апазыцыю.

Сілы рэвалюцыі аб'ядноўваюць сілы контррэвалюцыі. На Заходняй Беларусі мы бачым яскравае пацьверджаньне гэтай ісьціны. **Нацыянал - фашысты аб'ядналіся ў адзіным фронце з польскім фашызмам супроць агульнага ворага кампартыі Заходняй Беларусі, супроць нацыянал-вызваленчага руху, супроць СССР і БССР.**

І калі фашысцкая дыктатура разгортвае на Заходняй Беларусі шалёны белы тэрор, які носіць яскрава выяўлены антысавецкі, ваенны характар, калі пры катаваньнях у Луцкім астрозе імкненьні катаў зводзіліся да таго, каб прымусіць арыштаваных прызнаць сувязь камуністаў ЗБ з савецкім пасольствам, дык нацыянал-фашысты атручанымі ядамі сваіх газэт і лістовак, усёй сваёй дзейнасьцю вядуць ня менш узмоцненую анты-савецкую барацьбу. Нацыянал-фашысцкая прэса з усіх сіл лементуе аб «запроданасьці нацыянальнага руху Менску і Маскве».

Асабліва характэрны для высьвятленьня пазыцый нацыянал-фашызму іх адносіны да выкрыцьця і арышту ў БССР групы беларускіх контррэвалюцыйных нацыянал - дэмакратаў. Нацыянал - фашысты ўзялі пад сваю абарону Лёсікаў і Ластоўскіх, людзей, якія самі прызналіся ў тым, што яны выконвалі заданьні польскага генштабу. Што-ж, рука руку мые. Контррэвалюцыйныя нацыянал - дэмакраты ў БССР і нацыянал - фашысты ў Заходняй Беларусі—аднаго поля ягады, аднэй яблыні плады—яблыні польскага фашызму. Нацыянал-фашысты на Заходняй Беларусі зараз, калі іх прадажна - здрадніцкая роля выкрыта перад шырокімі масамі, з нябачным цынізмам адкрываюць свой твар—твар халуя польскага фашызму. Тая нарада кіраўнікоў заходня-беларускага нацыянал-фашызму з выдатнымі прадстаўнікамі польскай фашысцкай дзяржавы, нарада Астроўскага з Жалігоўскім, са Станевічам, на якой Астроўскі зрабіў праграмны даклад, праграмную справаздачу аб дзейнасьці і задачах нацыянал-фашызму, гэта нарада была дэклярацыйна названа нацыянал - фашысцкай прэсай «пераломным момантам, вызначыўшым паварот да Варшавы». Нібы-та раней нацыянал-фашысты не арыентаваліся на польскі фашызм, на фашысцкую Варшаву! Нібы-та раней нацыянал-фашысты ня служылі верай і праўдай польскай дыфэнзыве! Нібы-та раней уся іх задача ня была накіравана на барацьбу супроць кампартыі ЗБ і БССР.

Але зараз аб гэтым нацыянал-фашысты гавораць проста. Раней яны гэта ўтойвалі. Зараз Астроўскім і ўсім нацыянал-фашызмам прызнаецца ўзаконенай бела - польская акупацыя Заходняй Беларусі. Зараз Астроўскі і ўвесь нацыянал-фашызм проста заклікаюць да ўзмацненьня акупацыі і да інтэрвэнцыі супроць Савецкай Беларусі. Вось што, напрыклад, піша былы грамадавец Акінчыц, які запрадаўся польскаму фашызму, у сваёй брашуры, выданай на сродкі польскай дыфэнзывы: «Я пераканаўся, што беларускае пытаньне можа быць вырашана толькі тады, калі прападзе тая галоўная перашкода, якая стаіць на дарозе да яго вырашэньня — гэта факт існаваньня камуністычнай дыктатуры ў Савецкай Беларусі». Так адкрыта яшчэ ніводнага разу ня пісаў ніводзін з самых мацёрых здраднікаў нацыянальна-вызваленчага руху на Заходняй Беларусі. **Зараз усенародна нацыянал-фашызм стаў на калені перад польскім фашызмам і цалуе батфоргы польскіх жандараў.**

Нацыянал-фашысты з радасьцю пашлі насустрэч тэй актывізацыі польскага фашызму, якая зараз так моцна адчуваецца і на Заходняй Украіне і на Заходняй Беларусі. Польскі фашызм хоча дабіцца хоць-бы відзімасьці польска-украінскага і польска-беларускага зьбліжэньня, накіраванага супроць УССР і БССР.

Якая-ж тая праграма, тая пляцформа, на якой адбываецца гэтая згода нацыянал - фашызму з польскай фашысцкай дыктатурай? Гэта пляцформа зводзіцца да наступных патрабаваньняў, якія выставіў Астроўскі ў сваёй справаздачы перад прадстаўнікамі польскага ўраду ў Вільні: 1) адну беларускую школу на павет, 2) паскорыць камасацыю побач з дапамогаю памешчыкам. Вось і ўсё!

Адну беларускую школу на павет! Вось праграма - максымум нацыянал-фашызму ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Паскорыць правядзеньне камасацыі, г .зн. узмацніць кулацтва—вось адзінае патрабаваньне ў галіне аграрных рэформ!

Вось уся гэтая нікчэмная жабрацкая «праграма патрабаваньняў», якая да таго-ж выстаўляецца, як праграма —максымум!

Для нас зусім ясна, што нават і гэтыя «патрабаваньні» адыгрываюць толькі ролю дымавой заслоны. Нацыянал - фашызм, перапоўнены страхам **перад новым уздымам рэвалюцыйнага руху, перад тварам ідучай кансалідацыі нацыянал - вызваленчага руху, перад тварам магутнага будаўніцтва сацыялізму ў СССР і БССР,** гатовы адмовіцца і ад гэтай нікчэмнай праграмы. Бо галоўнае для яго, для нацыянал - фашызму—гэта зьвергнуць ненавісную пралетарскую дыктатуру ў БССР і ў СССР, гэта падрыхтаваць інтэрвэнцыю супроць пралетарскай дыктатуры, гэта разьбіць рэвалюцыйны ўздым, разграміць нацыянал - вызваленчы рух.

На Заходняй Беларусі працэс кансалідацыі сіл рэвалюцыі справаждаецца працэсам кансалідацыі сіл контррэвалюцыі ўсіх колераў і адценьняў.

Але ніякім сілам рэакцыі ня стрымаць узрастаючай рэвалюцыйнай хвалі. Грукаючая ў дзьверы Заходняй Беларусі пралетарская рэвалюцыя скіне фашысцкую дыктатуру і ў сьметнік гісторыі выкіне нацыянал-фашысцкі бруд.

С. М.

Шырыцца ўплыў КПЗБ

ВІЛЬНЯ. 6-IV Фашысцкі і нацыянал фашысцкі друк на Заходняй Беларусі ў апошні час пярэсьціць паведамленьнямі аб фактах «узмацненьня зруйнавальнай камуністычнай агітацыі», выкрыцьці па вёсках камуністычных ячэек і арыштах.

Нават з гэтых стушованых паведамленьняў урадавага фашысцкага друку можна меркаваць аб усё ўзрастаючым рэвалюцыйным уздыме рабочых і сялянскіх мас на Заходняй Беларусі і аб шпаркім росьце ўплыву Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі.

У гэтай сувязі характарна адзначыць вельмі частыя паведамленьні ў друку аб «барацьбе з камуністычнай агітацыяй» у раёнах прымежнай паласы.

Бядняцка серадняцкія масы прымежных раёнаў гледзячы нават праз кардоны войска, паліцыі і дыфэнзывы на працу палёў Савецкай Беларусі, чуючы работу трактароў ведаюць ваенна-авантурную ролю антысавецкіх фальшывак і выдуман беларускіх нацыянал-фашыстаў Астроўскіх і кампаніі, якія пад кіраўніцтвам польскага геншату рыхтуюць узброены напад на Савецкі саюз. Працоўныя прыгранічнай паласы лепш ведаюць аб тых велізарных дасягненьнях у галіне гаспадарчага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва БССР, якія маюць працоўныя Савецкай Беларусі ў соцбудаўніцтве пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі.

Гэтымі днямі, як паведамляе віленскі друк, адбылася паліцэйская аблава ў мэтах «зьнішчэньня камуністычных уплываў» у Даманаўскам пагранічным адцінку. Аблава адбылася, як гэта заўсёды водзіцца ў фашысцкай Польшчы крывавага маршала Пілсудзкага, з масавымі зьбіваньнямі сялянства. Праведзены шматлікія арышты. Дакладная колькасьць арыштаваных трымаецца ў сакрэце.

Такія аблавы адбываліся і ў другіх прымежных раёнах, як піша аб іх польская прэса, у мэтах «зьнішчэньня зруйнавальнай камуністычнай агітацыі».

Ліквідацыя агнём і мячом карных атрадаў войск, паліцыі і дэфынзывы рэвалюцыйнага руху на Заходняй Беларусі напамінае ўсім вядомае «уціхамірэньне» Заходняй Украіны і знаходзіцца ў поўнай сувязі з тым веснавым ажыўленьнем антысавецкай Польшчы—у выглядзе розных перакідак ваенных сіл, пробных мабілізацый, пасьпешнай пабудовы стратэгічных чыгунак на грошы французкага генштабу і ў галіне грамадзка-палітычнай—шалёным разгортваньнем антысавецкай кампаніі, фабрыкацыі розных антысавецкіх фальшывак і працэсаў (працэс Палянскага).

Пралетарыят і працоўныя масы Заходняй Беларусі добра ведаюць антысавецкія пляны польскага імпэрыялізму і тую агідную ролю ў іх выкананьні беларускіх нацыянал-фашыстаў.

Пад кіраўніцтвам КПЗБ рабочыя і бядняцка-серадняцкія масы Заходняй Беларусі ваенную антысавецкую авантуру сусьветнага імпэрыялізму ператвораць ў вайну грамадзянскую!

Абуджаюцца пляны антысавецкай узброенай авантуры

ВАРШАВА, 3 красавіка. (ТАСС). У штотыднёвіку «Пржэлом», органе так званых «левых» пілсудчыкаў, зьявіўся артыкул, які па сутнасьці сьцьвярджае вядомыя выступленьні эндэка Рамана Дмоўскага адносна антысавецкіх ваенных махінацый, застрэльшчыкам якіх павінна быць польская дзяржава. «Амаль кожны год,—піша «Пржэлом»,—ледзь толькі пачынае трава вылазіць з-пад веснавога сьнегу, астываючы капіталістычны сьвет пакрываецца румянцам «ваеннага ўздыму», разьлічанага на пагібель нашага, ня вельмі прыемнага ўсходняга суседа. Кожны год у весну ў іншых мазгох абуджаюцца пляны «інтэрвэнцыі», якая згодна гарачым жаданьням усёй міжнароднай фінансавай клікі павінна неабходна пасяліцца ў Крамле самога Кірыла... У некаторых цэнтрах Эўропы думаюць аб тым, каб у адзін добры дзень запаліць жар на нашай усходняй граніцы». Далей «Пржэлом» выкрывае ролю панэўропэйскага руху, як заслоны для інтэрвэнцыяністскіх плянаў, і даводзіць, што гэтыя пляны падтрымліваюцца магутнейшымі біржавымі коламі з дэтэрдынгам нафтавым канцэрнам «Ройяль Дэтч» на чале. «Пржэлом» высьмейвае ўсіх, хто патрабуе, каб Польшча была «аплотам цывілізацыі» супроць Савецкага Саюзу, і піша: «Хоць гэта і можа паказацца ерасьсю, але сацыялістычная Расія зьяўляецца ў сто разоў больш «заходняй», чым старарэжымная Расія». «Пржэлом» даводзіць, што для ўсіх, хто не жадае зьвязваць сябе «прыгнячаючым шаблёнам», зразумела, што індустрыялізацыя, тэхнічны і культурны прагрэс хутка зьнішчаюць у СССР сьляды ранейшай царскай адсталасьці.

Часопіс лічыць патрэбным заспакоіць польскага чытача ,што яна «ня мае намеру браць пад сваю апеку СССР», але яна рэзка асуджае інтэрвэнцыяністскія замашкі з пункту погляду «вялікадзяржаўных» інтарэсаў польскае дзяржавы, якія, паводле слоў часопісі, не дазволяць больш страціць ніводнага паляка ў мундзіры, ніводнага горнашлёнскага гарняка ў авантуры ананімных канквістардаў і кандацьераў.

Баючыся, як-бы не аказаўся пад сумненьнем яго «партыятызм», «Пржэлом» закончвае свой артыкул заявай: «Надойдзе час, зноў пойдуць у бой рады польскіх салдат... але толькі па загаду рэспублікі і ў яе інтарэсах».

***

ВАРШАВА, 3 красавіка. (ТАСС). Польскі міністар гандлю і прамысловасьці Прыстар апублікаваў у друку абшырнае інтэрвью, у якім ён разьвівае ўрадавую праграму морскіх пабудоў. Прыстар прызнае, што абмежаваньне эміграцыі вельмі моцна адбілася на польскіх пасажырскіх лініях. Але, ня гледзячы на гэта, польскі ўрад, паводле слоў Прыстара, рашыў як-бы та ні было павярнуцца «тварам да мора». Урад распрацаваў абшырны пяцігадовы плян пабудовы новых суднаў, пашырэньня порту ў Гдыні і г. д., прычым усе гэтыя пляны «узгоднены з ангельскім морскім ведамствам».

МІЖНАРОДНАЯ ХРОНІКА

⊙ Выбары завкому на фабрыцы фарба «Левер кузан — (Нямеччына) —закончыліся значным посьпехам рэвалюцыйнай профапазыцыі. За чырвоны сьпіс падана 1002 галасы (у мінулым годзе ніводнага голасу). У апошнія гады на прадпрыемстве «Левер кузан» праведзены масавыя звальненьні рабочых, спачуваючых камуністам. На прадпрыемстве не засталося амаль ніводнага камуніста. За 4 гадзіны да выбараў быў звольнены з фабрыкі галоўны кандыдат чырвонага сьпіску.

⊙ У Гельсавіцах (Верхняя Сілезія) беспрацоўныя гарнякі на свой страх і рызык пачалі эксплёатаваць адну закінутую капальню. Беспрацоўныя працавалі на гэтай капальні некалькі месяцаў, у дзьве зьмены, бяз дзён адпачынку. Гэтымі днямі па патрабаваньні ўлады на капальню прыбыла спэцыяльная камісія і паліцэйскія ўлады па даручэньню якіх уваход быў ўзарваны. Беспарцоўныя абураны зруйнаваньнем капальні, на якую было пакладзена імі столькі працы.

⊙ Саюз прадпрыемцаў **Саксонскай** будаўнічай прамысловасьці абвясьціў сёньня лёкаут усім будаўнічым рабочым **Саксоніі** з мэтай прымусіць рабочых згадзіцца на 14 проц. скарачэньня зарплаты.

⊙ Аўстрыйскія пасланцы **ў Белградзе і Будапэшце** заявілі ад імя аўстрыйскага ўраду аб разрыве 1-га ліпеня 1931 году гандлёвых дагавораў з Югаславіяй і Вэнгрыяй. Прадбачацца перагаворы аб новых дагаворах.

Мы бадзёры, мы моцна стаім на сваей дарозе!

Ліст з астрогу

Дарагі таварыш!

Учора толькі скончылася наша барацьба не на жыцьцё, а на сьмерць з фашыстаўска-астрожнай адміністрацыяй. Скончылася сямідзённая галадоўка. Яшчэ сілы слабыя, але пішу, паведамляю цябе аб цяперашнім нашым становішчы.

Што ў нас чуваць?.. Вельмі многа. І на валавой скуры не апішаш...

У апошні час фашыстаўская астрожная адміністрацыя пачала на нас шалёную атаку, хоча ўвесьці фашыстаўскі астрожны рэгулямін. Забараніла нам перадаваць з камары ў камару харчы, кнігі, газэты, ня прызнала прадстаўніка ад ўсіх палітвязьняў, павесіла на вокны бляшаныя аканіцы, так што ў камэры цэлы дзень панує змрок. Вольны спацыр забаронены.

Калі мы супраціўляліся гэтаму, на нас накінуліся 30 дазорцаў з начальнікам на чале, б'ючы нас ключамі, нагамі, кулакамі, а за наш пратэст пакаралі яшчэ на месяц, забаранілі з волі атрымліваць падачы, газэты. Кожны амаль ліст высланы на волю канфіскуецца. Немагчыма проста пералічыць тыя зьдзекі, якімі карыстаецца фашыстаўская адміністрацыя, каб задушыць нас фізычна і духоўна.

Нашае становішча было даведзена да крайнасьці. І мы, палітвязьні Стэфаньскага астрогу разам з Лушкімі ўзяліся за нашую апошнюю зброю, за галадоўку. Няма нажаль месца, часу і магчымасьці апісаць усе тыя зьдзекі і пакуты, якія мы перажывалі за час сямідзённай галадоўкі. Напішу тут толькі аб некаторых фактах.

На трэці дзень нашай галадоўкі, калі мы былі вельмі аслабленыя, нас пачалі штучна карміць. У горла кожнаму запускалі гумовую кішку і налівалі нейкую зацірку. Дыхаць было немагчыма. На кожнага навальвалася некалькі дазорцаў, выкручваючы рукі і ногі. Пасьля «кармленьня» валаклі ў карцар і па дарозе ў гэтых цёмных карцэрах дазорцы кідаліся як зьвяры і зьбівалі кожнага аж да страты прытомнасьці. Пасьля, цягнучы назад у камару, рабілі масаж.

Пракурор бачачы ўсё гэта—усьміхаўся.

— Галадоўка пасьля сямі дзён скончылася.

Сёньня да нас прыбылі новыя таварышы з волі «на поўнае ўтрыманьне». Апавядаюць, што ў апошні час на волі адбываецца вялікія арышты і страшэнныя катаваньні ў засьценках дыфэнзывы. Дыфэнзыва катуе арыштаваных да сьмерці. Становішча цяперашняе ў горадзе і на правінцыі жахлівае. З ростам беспрацоўя, галечы і голаду ў горадзе і вёсцы, растуць арміі шпікоў і мацнеюць дыфэнзывы. Кожны, хто толькі адважыцца сказаць слова аб сваім цяжкім становішчы па падае ў падазрэньне, яго арыштоўваюць і катуюць у дыфэнзыве да страты прытомнасьці. У вядомых засьценках, як Луцк, Ліда, Маладэчна, Горадня, Беласток, кожную ноч катуюць па некалькі дзесяткаў людзей ахраньнікі-садысты. Некаторыя арыштаваныя, якія ня могуць перанесьці такога тэрору, адважваюцца нанесьці сабе чым-небудзь удар, каб гэтым самым пазбавіцца жыцьця. Такіх выпадкаў надта многа, асабліва зараз, калі дыфэнзывы перапоўнены арыштаванымі.

Сучаснае становішча ў вёсцы надзвычай цяжкае. Дзікае прыдушэньне сялян падаткамі даходзіць да крайнасьці. Жыўцом гоняць у магілу! Нэндза, голад гэта першыя здарэньні ў вёсцы. Гмінныя войты, пісары, папы, ксяндзы і іншая зграя—верныя супрацоўнікі дыфэнзывы, фальшыва сьведчаць на кожнага падазронага дапамагаюць арыштоўваць і г. д. Па цэрквах і касьцёлах папы і ксяндзы замест розных маленьняў запужваюць несьвядомых і цёмных сялян і рабочых рознымі пекламі, намаўляюць быць паслухмянымі і г. д.

Па гарадох таксама становішча з кожным днём пагаршаецца. Кожны дзень сотні рабочых і іх сем'яў выкідаюцца на вуліцу. Расьце армія беспрацоўных, якая асуджана на галодную і халодную сьмерць. Дапамога даецца толькі тым, якія яшчэ ні ў чым не заўважаны дыфэнзывай. А падазроныя маюць «прытулак» у дыфэнзыве і па астрогах. Беспрацоўныя па гарадох галодныя дэманструюць сваю гатоўнасьць уступіць у апошні бой за працу, за хлеб, за ўладу.

Польскія астрогі, якія ў апошні час надзвычайна перапоўнены рабочымі і працоўным сялянствам, маюць характар і выгляд магілак, дзе заграбаюць здаровых маладых людзей. Варункі цяпер у нас надзвычайна цяжкія. Няма таго дня, каб ня было якога-небудзь канфлікту паміж астрожнай адміністрацыяй і палітвязьнямі, а ўсьлед за гэтым сыплюцца рознага роду кары: пазбаўляюць прагулак, кніг, газэт, набачаньня, падач і інш. Астрожныя харчы, якімі кормяць нас фашыстаўская астрожная адміністрацыя зусім нікчэмныя. Толькі дзякуючы дапамозе МОПР'у і радкай дапамозе бацькоў і сваякоў ёсьць магчымасьць падтрымаць сваё здароўе, вельмі падарванае тэрорам, голадам і зьдзекамі.

Але, ня гледзячы на такое становішча, у якім мы зараз знаходзімся—мы моцна стаім на сваёй дарозе, бо верым і адчуваем, што нашая волатная камуністычная партыя ўсё больш і больш мацнее, усё больш набывае ўплыў сярод шырокіх рабочых мас і мабілізуе іх на барацьбу з дзікім пеклам польскага і сусьветнага фашызму.

Мы моцна верым, што сацыялістычнае будаўніцтва, у якім удзельнічаеш ты—гэта нож у сэрца сусьветнаму імпэрыялізму і адначасова гэтае будаўніцтва—зьвястун сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, якая канчаткова сарве ланцугі з працоўных мас ва ўсім сьвеце.

З брацкім прывітаньнем Д.

Палітвязень з «Стэфанаўкі» Вільня, 1931 г.

Развал фашызму ў Нямеччыне

БЭРЛІН, Разнагалосьсі ўнутры арганізацыі нацыянал - сацыялістаў (фашыстаў) набываюць усё больш шырокія памеры. Актывісты «штурмавых атрадаў», нацыянал-сацыялістаў у Бэрліне і ў правінцыях Брандэнбург, Мэкленбург, у Памараніі і ва Ўсходняй Прусіі заявілі аб сваёй салідарнасьці са Сценесам, адначасова выказваючыся супроць Гітлера. Аднак усе партыйныя арганізацыі пералічаных правінцый працягваюць падтрымліваць Гітлера. Такім чынам у Паўночнай Нямеччыне палітычныя разнагалосьсі сярод нацыянал-сацыялістаў прывялі да расколу паміж партыйнымі арганізацыямі і іх баявымі атрадамі. Сценес разам з адданымі яму кіраўнікамі штурмавых атрадаў апублікаваў заклік, накіраваны супроць Гітлера. У гэтым закліку гаворыцца аб тым, што **«арганізацыя штурмавых атрадаў моцна пацярпела па віне палітычнага кіраўніцтва нацыянал - сацыялісцкай партыі, якое заразіла іх буржуазна-лібэральнымі тэндэнцыямі.** Далейшым **лібэральнымі тэндэнцыямі.**

Зусім зразумела, што галоўнай прычынай разнагалосьсяў унутры нацыянал-сацыялістаў зьяўляецца расчараваньне шырокіх пластоў прыхільнікаў нацыянал-сацыялістычнай партыі ў палітыцы партыі. У кожным разе **гэты раскол прысьпяшае працэс разыходжаньня нацыянал-сацыялісцкай партыі.** Аднак, мяркуючы па суадносінах сіл, трэба лічыць, што пераможцам у гэтай барацьбе ў арганізацыйных адносінах будзе Гітлер, **боён мае ў сваім распараджэньні буйныя сродкі, атрыманыя і якія атрымлівае ад буйных прамыслоўцаў і фінансавага капіталу, у той час, як члены штурмавых атрадаў у пераважнай сваёй большасьці зьяўляюцца з беспрацоўных і зьнішчаных дробна-буржуазных пластоў.**

Аб палітычных плянах Гітлера можна меркаваць па сакрэтным лісьце, накіраваным да членаў агульна-нямецкага камітэту нацыянал-сацыялісцкай партыі. У сваім лісьце ён заяўляе, што ў бліжэйшы час для яго падойдзе магчымасьць легальным і парлямэнцкім спосабам прысьці да ўлады. Калі гэтая магчымасьць ня будзе выкарыстана, дык наўрад калі-небудзь будзе зноў падобнага роду зручны выпадак для нацыянал-сацыялісцкай партыі. Аднак, для таго, каб дабіцца мэты—коаліцыі з правымі буржуазнымі партыямі неабходна з коранем вырваць усе рэвалюцыйныя сацыялістычныя настроі сярод нацыянал-сацыялістаў. Таму ў бэрлінскай арганізацыі, радыкалізм якой ужо зрабіў партыі шмат шкоды, павінны быць праведзены радыкальныя зьмены. **Гэтлер прадставіў кіраўніку бэрлінскай партыйнай арганізацыі Гебэльсу паўнамочвы на грунтоўную «чыстку» партыі.** У адпаведным лісьце, накіраваным да Гебэльса, Гэтлер заяўляе: «Зусім незалежна ад вынікаў, неабходна выдаліць з партыі ўсе гнілыя элементы, незалежна ад іх функцый, давесьці беспаваротна справу да канца ў гэтым кірунку, і няхай ніякія апасеньні не тармозяць вашых рашэньняў».

Якуб Колас

Яны пратэстуюць

Сярод жывёліннага і расьліннага згуртаваньня трапляюцца прыклады так званага сымбіёзу. Дзьве асобі, розныя ў сваіх характарах і прыродзе, жывуць разам. Звычайна слабейшы індывід прыстасоўваецца да болей моцнага і каля яго жывіцца. Таксама і акулы маюць каля сябе шмат сваіх нахлебнікаў.

Але акулы бываюць розныя: і тыя паны-ваяводы, што сьсяць Польшчу «ад можа да можа» і крыважэрнымі вачыма паглядаюць на краіну Саветаў, каб увабраць яе ў свой панскі прожар, ёсьць таксама акулы, і акулы паганага гатунку. Гэтыя ваяводы-акулы і падобны да іх іншы дармаедзкі зброд адкрыта заяўляюць аб сваіх прожарскіх імкненьнях на ўсход. Іхняя, бачыце гістарычная місія ня скончана, і яны прад'яўляюць свае права на «землі панства польскага». А затым—яны наогул бяруць на сябе шляхетную ролю рыцараў эўрапэйскай культуры, каб перагарадзіць доступ на захад бальшавіцкаму «барбарству». Рабочыя і працоўнае сялянства Савецкай Беларусі добра ведаюць, што хаваецца пад гэтым імкненьнем цьвілых драпежнікаў. У гэтых паноў-акул ёсьць свае нахлебнікі і прыслужнікі—тыя самыя, што плаваюць у «Беларускай крыніцы» ды звоняць у «Беларускім звоне». Аб матывах і характары нядаўняга іхняга звону пісаў Янка Купала ў сваім лісьце ў рэдакцыю «Зьвязды» (№ 90 за 2 красавіка 1931 г.).

Яны пратэстуюць!

Балесна скрыжавалі рукі і хаўтурным звонам публічна звоняць аб бальшавіцкіх «зьдзеках» над беларускай культурай, над беларускім народам і праліваюць воўчыя сьлёзы з прычыны імі-ж правакацыйна выдуманых фактаў.

Чаму яны пратэстуюць?

Яны пратэстуюць, бо бальшавікі ўскрываюць гнойнікі буржуазнай ідэалёгіі, тыя стрыжані, праз якія сочыцца бруд і кроў інтэрвэнцыі і ўся тая пошласьць, што неадлучна ад яе. Яны плачуць па шляхецка-кулацкіх хутарах, апорных пунктах польскага фашызму, што зьмятае бальшавіцкая калектывізацыя сельскай гаспадаркі, яны пратэстуюць, бо паном-акулам, пад чыім хвастом яны плаваюць, няма тут дзе зачапіцца, і іх прожар рызыкуе застацца пустым, высахнуць і лопнуць. Яны пратэстуюць супроць пасьпяховага ажыцьцяўленьня пяцігадовага пляну, супроць трыумфу новай пралетарскай праўды на зямлі.

Паны заступнікі, пратэстанты і плакальшчыкі! Ці не нагадваеце вы сабою таго ваўка, што прышоў да пастуха, у якога папрападалі авечкі, каб выказаць свой жаль? І ці ня тое самае скажа вам працоўны беларускі народ, што сказаў таму ваўку пастух: ты плачаш, дружа, таму, што няма табе больш чым пажывіцца?

Так, гэта праўда, што савецкая ўлада і бальшавіцкая партыя выкарчоўвае ўсякае карэньне, што можа даць парасткі панскага дармаедства, зародкі эксплёатацыі, кабалы, нацыянальнай прыгнечанасьці, уціску і зьдзеку над беднатою, паразытызму і ўсякага іншага папоўска-ксяндзоўскага непатрэбства: даволі зносіла зямля ўсякага паскудства, бруду і смуроду ад якіх даўно загніў стары сьвет, апосталамі якога зьяўляецеся вы.

Вы пратэстуеце, але вашы рукі ў брудняй крыві, у крыві закатаванага, прыгнечанага панскай дэфэнзываю, карнымі экспэдыцыямі, пятою Пілсудзкага працоўнага люду ў межах Заходняй Беларусі і Украіны. Няшчасны, нікчэмны, фальшывы голас ваш губіцца ў крыках болю і пакуты дзесяткаў тысяч палітвязьняў — лепшых сыноў беларускага народу, над якімі чыняцца сярэднявечныя пыткі ў засьценках панскіх дэфэнзыў. Лепшы сын працоўных мас, правадыр іх і змагальнік за іх вызваленьне, Б. Тарашкевіч подла схоплен служкамі Пілсудзкага і пасаджан у вастрог. Дзе голас вашага пратэсту?

На магіле беларускай культуры, каванай вашымі рукамі і прытаптанай груба нагамі, фальшыва плачаце вы над лёсамі беларускага народу.

І ці могуць паверыць вам працоўныя масы, ад імя якіх самазванна выступаеце вы, п. п. Астроўскія, гандляры сваім сумленьнем і крывёю запраданага вамі польскай дэфэнзыве беларускага народу? Ці ня гэта ёсьць ваша абарона яго правоў, аб якой звоніць ваш «Б. звон» («Беларусская справа і польскае грамадзянства», «Бел. звон, № 7, Вільня 30-III 1931 г.), дзе вы цынічна зьдзекуецеся ў кампаніі з ваяводамі Кіртыклісамі, пасламі Станкевічамі, генэраламі Жэлігоўскімі і іншымі катамі беларускай культуры над гэтай культурай?

Прэч ваша словаблудзтва!

Працоўныя масы, беларускі народ, прыпомняць вам гэтыя зьдзекі і гэта гандлярства яго крывёю!

Линейная калибровочная мишень LR-BE4-V2

САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЖЫВЕЛАГАДОЎЛІ—МОЦНУЮ КАРМАВУЮ БАЗУ!

ЗАДАНЬНЕ УРАДУ АБ АРГАНІЗАЦЫІ УНУТРАНЫХ КАРМОВЫХ РЭСУРСАЎ НЯ ВЫКАНАНА

Белпаляводсаюз ня выканаў заданьня па пашырэньні плошчы пад насеньне лугавых траў

БЯЗЬЛІТАСНА ЗМАГАЦЦА З АПАРТУНІСТЫЧНАЙ НЕДААЦЭНКАЙ СТВАРЭНЬНЯ КАРМАВОЙ БАЗЫ

Апартуністы з Аршанскага райза скарацілі плошчу засеву бульбы супроць заданьня на 44 проц.

Нажаць на ўсе рычагі! Кармавыя фонды павінны быць створаны. Прымусіць кулака выканаць цьвёрдыя заданьні па фуражу

Выкарыстаць унутраныя кармавыя рэсурсы

Курс узяты партыяй на разьвіцьцё буйных жывёлагадоўчых фабрык малака і мяса поўнасьцю сябе апраўдаў на працягу апошніх год. Саўгасы і калгасы сталі сапраўднымі фабрыкамі, якія хутка змогуць задаволіць усе запатрабаваньні рабочай клясы ў мясных і малочных прадуктах.

... «Усе саўгасы ўжо ў 1930 г. здалі дзяржаве таварнай прадукцыі на суму больш 200 мільёнаў руб. (у тым ліку 72 мільёны пуд. зярна, звыш мільёну пуд. мяса...)» З пастановы VI зьезду саветаў па дакладзе тав. Якаўлева).

БССР таксама мае значныя дасягненьні ў галіне будаўніцтва буйных жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў. Усе прароцтвы правых ухілістаў і малавераў аб немагчымасьці арганізацыі буйных фабрык мяса і малака аказаліся бітымі.

Аднэй з асноўных задач, якія зараз стаяць у галіне жывёлагадоўлі—гэта падвядзеньне пад яе моцнай кармавой базы, у прыватнасьці, забесьпячэньне жывёлы кармамі да пачатку вясны. З прычыны няўраджаю траў ў мінулым годзе ў многіх гаспадарках сацыялістычнага сэктару зараз не хапае грубых кармоў.

Таму зараз павінны быць ужыты самыя рашучыя захады, каб выйсьці з гэтага становішча і поўнасьцю захаваць да вясны ўсё стада.

Поруч з гэтым трэба адзначыць, што ў нас ня выкарыстаны ўсе ўнутраныя магчымасьці. Да апошняга часу пытаньню выкарыстаньня ўнутраных рэсурсаў адводзіцца мала ўвагі. Узяць хоць бы загатоўкі грубых кармоў. На 1-е красавіка загатоўкі па сену выкананы на 67,3 проц., па саломе—41,6 проц. Цэнтральныя і раённыя арганізацыі не зьвяртаюць належнай ўвагі на загатоўку грубых кармоў. Кулак карыстаецца прымірэнчымі адносінамі і разбазарвае кармы. У Хойніцкім раёне, напрыклад, не правяраецца як выконваецца цьвёрдае заданьне. Былі выпадкі калі кулацкія гаспадаркі замест 8 цэнт. кармоў здавалі толькі 1 цэнт. Ніхто, ні з раённых, ні з сельсавецкіх работнікаў не зварочваў увагі на такія абураючыя адносіны да выкананьня кулацка-заможнымі гаспадаркамі цьвёрдых заданьняў. У выніку такіх праваапартуністычных адносін па некаторых раёнах мы маем нязначнае выкананьне плянаў загатовак сена і саломы.

На 20-III г. г. Баркавіцкі раён выканаў пляны загатовак па сене на 33,1 проц., Межанскі—36,9 проц., Рагачоўскі—31,2 проц., Хойніцкі—39,3 проц., Церахаўскі—20,5 проц., Чэрыкаўскі—38,6 проц., Юравіцкі—18,3 проц.

Яшчэ горш абставіць справа з загатоўкай саломы. На Аршанскім пункце (пункт аб'ядноўвае некалькі раёнаў) пляны загатовак выкананы ўсяго на 38,5 проц., Гарадоцкім—30,3 проц., Горацкім—21,5 проц., Клімавіцкім—30,8 проц., Быхаўскім—25,3 проц., Слуцкім—31,4 проц., Хойніцкім—40 проц. і г. д.

Толькі Барысаўскі пункт выканаў сваё заданьне на 66,1 проц., Бабруйскі—63,5 проц.

У той жа самы час мы маем рад раёнаў, якія нават перавыканалі пляны загатовак сена. Напрыклад, Барысаўскі раён выканаў свой плян на 170,9 проц., Бягомльскі—191 проц., Халопеніцкі—175 проц., Чачэвіцкі—280 проц., Чавускі—279 проц., Стара-Дароскі—287 проц. і г. д. Гэта азначае, што ў тых раёнах, дзе вакол пытаньня загатовак была мабілізавана грамадзкая думка, там загатоўкі выкананы здавальняюча.

Другім ня менш важным пытаньнем зьяўляецца выкарыстаньне на корм жывёле адходаў бравароў, крухмальняў, сталовак і інш. У гэтай галіне таксама ня выкарыстаны ўсе магчымасьці. Цікава адзначыць, што ў той час, калі прыгарадныя гаспадаркі гор. Менску адчуваюць вялікі недахоп у корме, мы сустракаемся з такімі фактамі, калі адходы прамысловасьці і сталовак трапяць ці ў рукі прыватніка, ці проста псуюцца. Напрыклад, на півазарным заводзе «Беларусь» частку брагі забіраюць рабочыя заводу для сваёй жывёлы. Гэта самае назіраецца па сталоўках ЦРК, калі самы забіраюць афіцыянты, ці проста пастаронныя асобы. Ня поўнасьцю скарыстоўваюцца на корм жывёле бульбяныя лушпайкі. Некалькі тыдняў таму назад са студэнцкай сталоўкі вывезьлі тры вазы пагніўшых лушпаек.

У той час, калі да кожнага грама кармовых прадуктаў трэба аднесьціся з самай суровай беражлівасьцю, калі павінны быць мабілізаваны ўсе магчымасьці ў гэтай галіне мы сустракаемся з фактамі яўна апартуністычных адносін да пытаньня скарыстаньня кармовых рэсурсаў.

З падобнымі праявамі трэба весьці самую рашучую барацьбу.

Мы ўжо адзначалі ў нашай газэце, што пры адсутнасьці грубых кармоў можна і трэба скарыстоўваць на корм маладое гальлё ліставых дрэў. Аб гэтым ёсьць дырэктывы Саюзнага НКЗ і НКЗ БССР. Але спытайце любую ўстанову: НКЗ, Белсельтрэст, Сьвінавод—што робіцца ў гэтай галіне—вы атрымаеце стэарэтыпны адказ:—ня ведаю. Толькі адзін Чачэвіцкі Райкалгассаюз паведаміў гэтымі днямі, што ён вызначыў адказнага работніка па загатоўцы кармоў з гальля і на гэтым абмежавалася ўся яго работа (дырэктыва НКЗ аб загатоўцы кармоў з гальля разаслана яшчэ ў першай палове сакавіка).

Таксама нічога ня робяць у гэтай галіне саўгаскія трэсты. Белсельтрэст зусім нічога ня ведае ці прыступілі саўгасы да загатовак гэтых кармоў. Сьвінагадоўчы саўгас імя Сталіна, у якога 65 коняй і 80 кароў засталіся без кармоў,—палец аб палец ня ўдарылі каб пачаць загатоўку корму з гальля. Саўгас Халопенічы спасылаецца на тое, што «няма ліставога лесу» (!?) З Дрыбіна таксама паведамляюць, «што блізка ля саўгасу няма лазы».

Вось якія адносіны існуюць да пытаньняў загатоўкі кармоў з гальля. Гэта трэба кваліфікаваць не як коснасьць, не як консэрватызм, а як сьвядомае шкодніцтва.

Зараз трэба рашуча ўзяцца за загатоўку і пераразьмеркаваньне ўнутраных кармовых рэсурсаў.

Загатоўкам грубых кармоў трэба надаць самы баявы характар.

Неабходна зараз-жа арганізаваць перакідку лішкаў кармоў з тых гаспадарак, якія яго маюць багата ў тыя, дзе яго няма.

Трэба ўстанавіць суровы кантроль над скарыстаньнем на корм усіх адходаў прамысловасьці і сталовак.

Загатоўкам на корм гальля з ліставых парод трэба надаць самую сур'ёзную ўвагу.

Унутраныя кармовыя рэсурсы не мабілізаваны

Бабруйскі гарсавет праявіў злачынную бястурботнасьць у адносінах забесьпячэньня прыгараднага калгасу кармамі

Становішча з кармамі па радзе калгасаў Бабруйскага раёну надзвычайна напружанае. Па раёне на сёньняшні дзень налічваецца больш дзесятка калгасаў, якія ня маюць зусім корму і жывёла стаіць пад непасрэднаю пагрозаю галоднае сьмерці. Асабліва востра гэта пытаньне стаіць у прыгарадным калгасе імя Гарадзкога савету. Гарадзкі савет, лічачы сябе гаспадаром гэтага калгасу, з восені даў загад калгасу перадаць для транспарту дрэваапрацоўчага камбінату і Камунтрэсту 60 тон сена з умоваю, што гэта сена будзе зьвернута ў той час, калі яно патрэбна будзе калгасу. У сучасны момант калгас перажывае надзвычайна цяжкае становішча з кармамі, а арганізацыі, якія пазычылі ў калгасе сена і ня думаюць аддаваць яго. З прычыны недахопу кармоў у калгасе здохла некалькі галоў жывёлы. За апошні час прышлося выбракаваць каля сотні кароў з тае прычыны, што ад недаяданьня яны страцілі малочнасьць.

Тая злачынная недаацэнка, якую праявілі асобныя калгасы ў пытаньні закладкі сілосу з восені, дала свае вынікі цяпер. Плян сіласаваньня па раёне выкананы ўсяго толькі на 21 пр. Замест мяркуемай закладкі яго ў разьмеры 5255 тон, закладзена ўсяго толькі 1144 тоны.

Тыя калгасы, якія заклалі сілос, у сучасны момант маюць вялікае падтрыманьне ў харчаваньні жывёлы.

З боку раду калгасаў, як «Прагрэс», «Найер-Лэбн», «Чырвоная Рыня» і інш., былі праяўлены самыя злачынныя адносіны да скарыстаньня кармоў. Калгас «Найер-Лэбн» меў 65 га сенажаці, 38 га сеяных траў, ураджай з якіх мог цалкам задаволіць патрэбу ў кармох, гэтыя кармы ішлі на подсьціл, даваліся жывёле бяз нормы, а зараз калгас зусім ня мае кармоў. Такое становішча стварылася і ў калгасе «Прагрэс», і ў радзе іншых калгасаў.

Ёсьць і горшыя выпадкі. Калгас «Чырвоны лётчык» зусім прадаў сваё сена, а зараз сам узьняў трывогу аб тым, што ў яго няма кармоў.

Ня гледзячы на такі крызіс ў кармох, загатоўкі сена і саломы па раёне праходзяць нездавальняюча. Агульны раённы плян выкананы на 70 проц. Адлічэньні ад загатовак сена і саломы паступаюць у калгасы надзвычайна слаба. Сельскія саветы ня прымаюць належных мер да поўнага спаганяньня з кулацкіх і заможных гаспадарак сена і саломы па цьвёрдых заданьнях. Сельскія саветы нават ня цікавяцца станам кармовых фондаў у калгасах. Па радзе калгасаў маюцца лішкі кармовых фондаў, але да апошняга часу ня была праведзена работа, каб перакінуць лішкі кармоў у тыя калгасы, у якіх кармоў мала ці зусім няма. Разам з гэтым трэба ўвесьці самую жорсткую эканомію ў выдаткаваньні кармоў у калгасах. Павінна быць рашуча выжыта тэндэнцыя калгасаў спадзявацца на тое, што кармы павінен даць калгассаюз. Рад калгасаў, у прыватнасьці калгас «Камуніст», стварыў брыгады з калгасьнікаў для дапамогі сельсавету ў выкананьні пляну загатовак і праверкі выкананьня заданьняў кулацкімі і заможнымі гаспадаркамі. Па гэтым прыкладзе павінны пайсьці і іншыя калгасы раёну. Адначасова трэба рашуча паставіць пытаньне аб тым, каб грубыя кармы ў выпадку іх нехваткі ўжываліся на корм жывёле ў выглядзе сечкі.

Брыгадзір «Савецкай Беларусі» А. Дамброўскі.

Сілос поўнасьцю сябе апраўдаў

Ельскі раён атрымаў 890 тон дадатковых кармоў

Калі ў мінулым годзе ў Ельскім раёне пачалі агітаваць за сіласаваньне кармоў, шмат якія аднаасобнікі і нават калгасьнікі адносіліся скептычна да гэтага мерапрыемства. Некаторыя дзядзькі, чухаючы патыліцу, гаварылі:

Адкрыцьцё сіласнай ямы ў калгасе «Камінтэр» Лёзьнянскага р-ну.

— Дзяды нашы гэтага не рабілі і нам яно непатрэбна.

Кулакі распускалі розныя хлусьлівыя чуткі пра сілос. Аднак, ня гледзячы, на коснасьць і кулацкую агітацыю, па раёне было праведзена сіласаваньне значнай колькасьці зялёнай масы. Нядаўна пачалі адкрываць сілосныя ямы. Сілос аказаўся добрым.

Дзякуючы правядзеньню сіласаваньня кармоў—раён зараз атрымаў 890 тон дадатковых сакавітых спажыўных кармоў.

На наступны год намячаюцца значна большыя пляны па сіласаваньні кармоў. Пад сілосныя культуры намячаецца заняць 500 га.

Поруч з гэтым раённыя арганізацыі павінны зараз-жа пачаць падрыхтоўку да будаўніцтва сілосных установах. Трэба дабіцца, каб у кожным калгасе, кожнай вёсцы былі пабудаваны сілосныя ямы, траншэі, вежы.

Герасіменка.

Прымусіць кулака выканаць цьвёрдыя заданьні

На сеназагатоўкі ў Бабчынскім сельсавеце Хойніцкага раёну, ніхто не зварочвае ніякай увагі. Да гэтага часу плян выкананы ледзь на 40 проц. Кулацка-заможныя гаспадаркі цьвёрдыя заданьні па сене поўнасьцю ня выканалі. Некаторыя гаспадаркі паздавалі па 3-5 цэнтн. сена і на гэтым абмежаваліся. Сельсавет ня ўжывае ніякіх захадаў, каб прымусіць кулакоў выканаць цьвёрдыя заданьні па грубых кармох.

Плян загатоўкі кармоў на Аршаншчыне ня выканан, жывёла не забясьпечана кармамі

Ня гледзячы на гэта апартуністы панізілі плошчу бульбы на 44 проц. супроць заданьня

Аршанскі раён мае садова-гародны і жывёла-гадоўчы напрамак. У раёне маецца 16 жывёлагадоўчых і 12 сьвінагадоўчых калгасаў. Рэшта калгасаў таксама атрымалі значныя заданьні па разьвіцьці жывёлагадоўлі.

Каб выканаць пляны па жывёлагадоўлі, трэба зараз-жа паклапаціцца аб стварэньні адпаведнай кармовай базы. Неабходна зараз-жа поўнасьцю забясьпечыць усе плошчы пад кармовыя культуры неабходнай колькасьцю насеньня.

Па пляну ў калгасах Аршанскага раёну вызначаецца пасеяць звыш 1000 гектараў аўсу, 1354 га бульбы, 454 га кораньплодаў, 627 га вікі, 955 га канюшыны і 355 га сілосных культур. Патрэбна адзначыць, што ўжо ў час плянаваньня засеву кармовых расьлін, раён зьменшыў **плошчу пасеву бульбы з 2400 га да 1354, што зьяўляецца зусім недапушчальным**; імкнуліся таксама зьнізіць пасеў сілосных культур. Гэта паказвае, як аднесьліся «сур'ёзна» да стварэньня кармовай базы ў нашым раёне яшчэ ў час яе плянаваньня.

Каб засеяць гэту плошчу, калгасы павінны мець насеньне, трэба арганізаваць сталы кантроль і праверку выкананьня плянаў. Патрэбна 39,45 цэнтн. насеньня кораньплодаў, 497 цэнт. сілосных культур, 1897 цэнт. вікі, 191 цэнт. кармовых траў, 20 цэнт. лугавых траў і 4800 цэнт. бульбы.

На сёньняшні дзень з патрэбнага насеньня ёсьць кармовых і лугавых траў 15,5 цэнт., сэрадэлі 85 кгр., вікі 186 цэнт., сілосных культур 13 цэнт. і кораньплодаў 15,4 цэнт. Гэта значыць, што плошча пад кармовыя культуры не забясьпечана патрэбным насеньнем і наогул стварэньню яе награжае зрыў. А разам з гэтым зрыў пагражае і выкананьню праграмы раёну па жывёлагадоўлі.

Райкалгассаюз і Райкаапсаюз павінны зараз-жа рашуча адмовіцца ад апартуністычнай стаўкі на самапёк і па-бальшавіцку ўзяцца за загатоўку насеннага матар'ялу. Разам з гэтым патрэбна праводзіць масавую работу па мабілізацыі ўвагі ўсіх калгасьнікаў вакол пытаньня стварэньня кармовай базы.

Кармовае пытаньне па калгасах Аршаншчыны зьяўляецца вельмі балючым пытаньнем. У 67 старых калгасах раёну на час веснавой сяўбы павінна быць забраніравана 5.500 цнт. грубых кармоў і 1.600 цнт. кармавога аўсу. Пакуль што па грубых кармох плян выкананы на 44 проц., па аўсу—77 проц. Такое становішча стварылася з прычыны таго, што ў мінулым годзе калгасна-каапэрацыйная сыстэма мала клапацілася аб кармох.

Праўда, недахоп кармоў можна было-б папоўніць за кошт загатовак фуражу, але і тут ня ўсё добра. Плян загатовак сена выкананы на 88 проц., саломы—на 58 проц. Тлумачыцца гэта тым, што частка сельсаветаў, як, напрыклад, Кудасаўскі, Кращвенскі, Пугляеўскі, Сталінскі і Рудкоўскі—значна адстаюць у справе загатовак сена і саломы. Гэтыя сельсаветы не націснулі як сьлед на заможна-кулацкія гаспадаркі, кулацтва выкарыстала прымірэнчыя адносіны з боку сельсаветаў і замест здачы дзяржаве разбазарыла кармы.

Райгандлю, Райкалгассаюзу і Райкаапсаюзу трэба зараз-жа паклапаціцца аб тым, каб забясьпечыць калгасы кармамі на час сяўбы.

А. Л.

Сустрэчным плянам сяўбы—па кулаку

БАБРУЙСК (наш кар.). У адказ на адозву III Усебеларускага зьезду калгасаў, калгас «СЬВЕТ», Бабовіцкага сельсавету высунуў сустрэчны плян веснавой сяўбы, павялічыўшы заданьне, якое дадзена яму раённым цэнтрам, на 48 гектараў.

Паводле высунутага калгасьнікамі сустрэчнага пляну пасеўная плошча аўсу павялічваецца на 20 проц. супроць вызначанай раёнам лічбы; пасеўная плошча ячменю—на 25 проц., бульбы—на 15 проц., вікі — на 50 проц., грэчкі—на 700 проц. і г. д.

Калгасьнікі калгасу «Сьвет» выклікаюць пасьледваць іх прыкладу ўсе калгасы Бабруйскага раёну.

Д. АЛАНСКІ.

СЛОВА—ЛЕПШЫМ

Фабрыка „Камунарка" паказвае лепшыя ўзоры перабудовы партработы тварам да вытворчасьці і барацьбы за бальшавіцкі прамфінплян

Заклік тульскіх рабочых да кожнага рабочага, да кожнага калгасьніка

Партколектыў на чале рабочае масы ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну

Шпаркія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва патрабуюць ад усіх нашых арганізацый перабудовы сваёй работы на новыя рэйкі. На гэты конт ёсьць адпаведная пастанова партыйных органаў. Ёсьць пастанова ЦК УсеКП(б) ад 21 сакавіка г. г. аб партмасавай рабоце ў цэху і брыгадзе. Як гэтую пастанову праводзяць у жыцьцё партарганізацыі на мясцох?

Мы сёньня паказваем як цукерная фабрыка «Камунарка» (Менск) праводзіць гэтую важнейшую дырэктыву ў жыцьцё.

У пастанове ЦК зазначана, каб у самы кароткі тэрмін ажыцьцёвіць дырэктыву XVI зьезду партыі «аб пагалоўным уцягненьні камуністаў і камсамольцаў у сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, а таксама павесьці рашучую барацьбу з ілжэўдарніцтвам, у першую чаргу сярод камуністаў і камсамольцаў»... Гэтая прапанова ЦК выконваецца. На фабрыцы амаль усе рабочыя (80 проц.) ударнікі.

Далей у гэтай пастанове ЦК мы чытаем: «партыйныя арганізацыі павінны забясьпечыць актыўны ўдзел у вытворчых нарадах лепшых ударнікаў, беспартыйных, камуністых і камсамольцаў». Гэта выконваецца добра. Мы павінны адзначыць, што фабрыка знаходзіцца ў нездавальняючых тэхнічных умовах паколькі яна старая, што перашкаджае разгортваньню работы. Усё-ж партарганізацыя сваю работу перабудавала па новаму.

У вытворчыя нарады ўцягнуты амаль усе партыйцы і комсамольцы. Шмат ударнікаў прымае ў гэтых нарадах самы актыўны ўдзел. Яны ўносяць сваё рацыяналізатарскія прапановы. Вось, напрыклад, брыгада тав. **Купэрштока**. Яна зьяўляецца аднэй з лепшых брыгад фабрыкі.

Прапановы рабочых таксама выконваюцца і праводзяцца ў жыцьцё. Прапановы т.т. **Карапачакідзіса** (мяккашакаладны цэх) і Шчырэца (гэтага-ж цэху) даюць шмат эканоміі. Іхнія прапановы ўжо рэалізаваны і праведзены ў жыцьцё.

«...ЦК прапануе перанесьці на ўсе прадпрыемствы... вопыт работы групавых і зьменных вытворчых нарад». На фабрыцы практыкуюцца нарады выхадных рабочых, нарады зьмен. На гэтых нарадах абгаварваюцца як вытворчыя пытаньні, так і пытаньні партмасавай работы.

На фабрыцы вядзецца барацьба за тэхніку. Арганізаваны палітэхнічны гурток, у які запісалася каля 80 чал. рабочых і работніц. З 26-га сакавіка на фабрыцы абвешчаны дэкаднік паходу за тэхніку. Для гэтай-жа мэты праведзена палітэхлётарэя. За добры адказ кожны рабочы атрымаў узнагароду. Гэты мэтад вельмі зацікавіў ня толькі партыйцаў, але і старых беспартыйных рабочых. На фабрыцы існуе сэктар палітэхнічнай вучобы і друку.

Прамфінплян фабрыкі нават перавыкананы на 17,8 проц. супроць Трэстаўскага пляну і на 9,7 проц. супроць сустрэчнага. Паасобна мяккашакаладны цэх выканаў свой прамфінплян на 27,9 проц. больш супроць сустрэчнага пляну.

У сакавіку месяцы падана 12 заяў у партыю.

Усе гэтыя факты гавораць за тое, што трыкутнік на чале з партячэйкай фабрыкі сапраўды перабудаваў сваю работу адпаведна з дырэктывамі партыі, адпаведна з тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва.

Азнаёміўшыся са становішчам партработы, нам трэба на гэтым фоне паказаць некаторых лепшых ударнікаў, якія зьяўляюцца прыкладнымі ў выкананьні прамфінпляну.

Вось рабочы тав. **Альпяровіч**. Гэта лепшы ўдарнік камсамольскай брыгады. Ударніца тав. **Розэнблюм** атрымала ўзнагароду за добрыя адносіны да працы. Такімі-ж добрымі, прыкладнымі ўдарнікамі зьяўляюцца рабочыя: т.т **Голуб, Клебанава, Гурвіч**. Гэта ўсё лепшыя ўдарнікі прадпрыемства.

На прадпрыемстве існуе скразная камсамольская брыгада карамельнага цэху з 10 чал. У мяккашакаладным цэху існуюць 3 камуны. На фабрыцы так сама існуе рабкораўскі актыў.

У выніку трэба сказаць, што зараз на фабрыцы ідзе падрыхтоўчая работа да яшчэ большага разгортваньня новых мэтадаў культмасавага абслугоўваньня рабочых у новым памяшканьні фабрыкі. Гэтае памяшканьне будзе праз 3-4 тыдні гатова. Тады, на больш шырокай базе яшчэ лепш будзе разгорнута партработа па выкананьні дырэктыў партыі, па яшчэ лепшае выкананьне прамфінпляну фабрыкі.

Л. М. П.

Прымем заклік тульскіх рабочых

За заклік ударнікаў імя 518 і 1040, за перагляд норм выпрацоўкі, за давядзеньне плянаў 3-га рашаючага году пяцігодкі да кожнага рабочага.

Ленінская ідэя сацыялістычнага спаборніцтва ператварылася ў магутную зброю ў руках рабочай клясы, саўгасьнікаў і калгасьнікаў. Гэтай ленінскай зброяй мы ператвараем СССР з краіны адсталай, з дробнай раскіданай сялянскай гаспадаркай у краіну перадавой тэхнікі, у краіну самай магутнай у сьвеце сельскай гаспадаркі. Мы будуем у СССР сацыялізм.

Ленінскім мэтадам сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва мы выконваем бальшавіцкую пяцігодку ў 4 гады, мы выконваем баявую праграму трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Мы бачым геаічную барацьбу за прамфінплян па радзе прадпрыемстваў БССР. У чырвоным сьпісе прадпрыемстваў, якія выканалі раней тэрміну прамфінплян у першым квартале трэцяга рашаючага году, мы сустракаем чырвонасьцяжны завод «Бальшавік», Менскую ф-ку «Камунарка», Гомельскую швэйную фабрыку «Камінтэрн», машынабудаўнічы завод імя Варашылава і рад іншых прадпрыемстваў.

З кожным днём расьце энтузіязм рабочай клясы, расьце ініцыятыва, растуць новыя ўзоры камуністычнай працы.

Адозва рабочых Тульскага заводу № 1, якая была абвешчана ў друку, мае вялізарную палітычную важнасьць. Тульскія рабочыя пішуць:

— Ці чулі вы аб тым, што мы ў гэтым годзе павінны пусьціць у ход 518 новых фабрык і заводаў, ці чулі вы, што мы павінны ў гэтым годзе адкрыць 1040 новых машына-трактарных станцый? Падумайце над гэтымі лічбамі нашых вялізарных перамог.

Рабочыя Тульскага заводу № 1 прапануюць у гонар 518 новых заводаў і фабрык, якія ўваходзяць у строй у гэтым годзе і 1040 машына-трактарных станцый, якія павінны быць адкрыты ў гэтым годзе, абвясьціць набор ударнікаў і разгарнуць у другім квартале бягучага году пытаньне аб перагледзе норм выпрацоўкі.

Тульскія рабочыя пішуць:

— «Мы прапануем: 1) давесьці да кожнага рабочага і калгасьніка лічбы нашых вялізарных дасягненьняў, каб кожны ведаў, што недарма затрачана столькі сіл і энэргіі. Нашы кроўныя накапленьні мы не растрацілі на вецер, а пусьцілі на будаўніцтва новых магутных гігантаў сацыялістычнай індустрыі і сацыялістычнага земляробства.

І далей.

«Мы прапануем у гонар новых прадпрыемстваў і новых МТС абвясьціць набор ударнікаў імя 518 і 1040. Няхай у гонар кожнага новага прадпрыемства да другой гадавіны сацспаборніцтва і вялізарнейшага сьвята працоўных 1 мая ўвальлецца новая тысяча ўдарнікаў».

Рабочыя тульскіх заводаў таксама прапануюць у другім квартале бягучага году разгарнуць баявую масавую кампанію за перагляд норм выпрацоўкі, якія ў сучасны момант у большасьці выпадкаў устарэлі.

— Гэтыя нормы раўняліся выпрацоўцы сярэдняга рабочага пры старай тэхніцы—пішуць тульскія рабочыя—а нам трэба біцца за сустрэчныя нормы, за нормы, якія заваяваны лепшымі ўдарнікамі, брыгадамі і цэхамі.

— Толькі пры гэтых умовах мы выканаем заданьне па павышэньні прадукцыйнасьці працы на 28 проц. па СССР.

На заклік тульскіх рабочых задача нашых партыйных і прафэсыянальных арганізацый разгарнуць шырокую растлумачальную работу вакол гэтай адозвы, стаць на чале актыўнасьці рабочых мас за ўзьняцьце сацспаборніцтва на вышэйшую ступень, **за прызыў новых ударнікаў, за арганізацыю сустрэчных плянаў па нормах выпрацоўкі.**

Мы ня сумняваемся, што адозва тульскіх рабочых знойдзе жывейшы водгук сярод рабочых, сельгасрабочых і калгасьнікаў БССР, што на гэты заклік яны адкажуць новай хваляй сацспаборніцтва і ўдарніцтва, каб выканаць пяцігодку ў чатыры гады.

Другую гадавіну сацыялістычнага спаборніцтва, рабочыя, саўгасьнікі і калгасьнікі БССР адзначаць павялічэньнем радоў ударнікаў новымі тысячамі рабочых, змогуць мабілізаваць усю сваю энэргію і волю і пад бальшавіцкім кіраўніцтвам камуністычнай партыі і яе ЦК выканаюць і перавыканаюць народна-гаспадарчы плян 1931 году, скончаць пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў СССР.

Дубровенская і Сеньненская МТС

ня маюць бальшавіцкіх тэмпаў

Вывады абсьледаваньня гатоўнасьці да веснавой сяўбы па двух толькі МТС—Дубровенскай і Сеньненскай сьведчаць аб тым, што МТС і абслугоўваемыя імі калгасы ў падрыхтоўцы да сяўбы маюць рад буйных прарываў. Пачнем з пытаньня аб тэмпах. Яшчэ ў канцы лютага была разаслана кожнай МТС дырэктыва і інструкцыя, а 20 сакавіка Беларускае аддзяленьне Трактарацэнтру тэлеграфна паведаміла, што дзень агляду гатоўнасьці да сяўбы назначан на 25 сакавіка; Дубровенская-ж і Сеньненская МТС да гэтага дню не пасьпелі арганізаваць гэты агляд і надаць яму характар масавай гаспадарча-палітычнай кампаніі.

Саветы пры МТС, якія закліканы зьяўляцца зьвяном, зьвязваючым МТС з калгасамі, і павінны быць гаспадарчым дарадчым органам пры МТС, яшчэ да гэтага часу ня скліканы, што зьяўляецца буйнай палітычнай і гаспадарчай хібай.

Слаба ўвязваецца кампанія па заключэньні датавораў з калгасамі на абслугоўваньне іх машына-трактарнай станцыяй з пытаньнем далейшай калектывізацыі ў раёне, асабліва ў бліжэйшым да МТС радыусе.

У Дубровенскім раёне выяўляецца недахват рознага насеньня; бульбы маецца 38 проц. патрэбы; абмен простага насеньня на сартавое праходзіць марудна; ачышчана толькі 30 проц. насеньня. Замест вызначаных па пляну кантрактацыі 6000 га закантрактавана толькі 492 га. Аб ходзе рамонту калгаснага інвэнтара няма зьвестак ні ў Райза, ні Райкалгассаюзе, ні ў МТС.

У раёне ёсьць 26 спэцыялістаў па сельскай гаспадарцы, але мяркуючы па тым, што вытворчыя пляны ў многіх калгасах яшчэ ня складзены, трэба сказаць, што гэтыя спэцыялісты яшчэ не пераключылі сваю работу на ўдарныя тэмпы і прымаюць слабы ўдзел у падрыхтоўцы да бальшавіцкай вясны.

На пляцы каля старой б. Дубровенскай сынагогі стройнымі радамі выстаўлены 40 новых трактараў «Фордзон-Пуцілавец», а выпрабаваць іх спраўнасьць няма магчымасьці з-за адсутнасьці неабходных змазачных матэрый. МТС своячасова аб гэтым не паклапацілася. Кожны трактар трэба разабраць, праверыць, змазаць, заправіць і пусьціць, а для гэтага трэба шмат гадзін кваліфікаваных мэханікаў. маецца-ж іх усяго 2-3 чалавека.

Рэалізацыя акцый Трактарацэнтру на будаўніцтва МТС і машынізацыю сельскай гаспадаркі як у Дубровенскім, так і Сеньненскім раёнах праходзіць вельмі слаба. Нязначны процант рэалізаваных акцый у значнай частцы складаецца ня з сродкаў калгасаў, калгасьнікаў, аднаасобнікаў, беднякоў і серадьнякоў і інш. сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў, а з сродкаў фабрычных рабочых (Дубровенская мануфактурн. ф-ка) і членаў розных прафсаюзаў, ня маючых ніякай сувязі з сельскай гаспадаркай.

Зразумела, сярод арганізаванага пралетарыяту больш лёгка праводзіць мабілізацыю сродкаў—ён чула адгукваецца на заклік свайго ўраду і сваёй партыі, але гэта значыць ісьці па лініі найменшага супраціўленьня, г. зн. біць міма цэлі, гэта стаўка на самацёк, гэта сапраўдны апартунізм на практыцы.

Пытаньне аб беражлівых адносінах да трактараў і складанейшых с.-г. машын набывае актуальнейшае значэньне. Недарма ўрад унёс у Крымінальны Кодэкс спэцыяльны артыкул, жорстка караючы за псаваньне трактару і прычэпнага інвэнтару.

МТС вакол гэтага пытаньня не стварыла яшчэ грамадзкай думкі. І вось мы ў Сеньненскім раёне зьяўляемся сьведкамі агіднейшага факту: адсылаюцца на санях 6 трактараў з МТС у калгасы Расьненскага сельсавету. Вязуць іх самі калгасьнікі. Пяць з гэтых трактараў дастаўляюцца ў парадку, а адзін аказваецца паламаным і знаходзіцца яго бяспрытульным, бо возчыкі дзесьці па дарозе напіліся п'янымі.

Па справе, зразумела, вядзецца тэрміновае расьследваньне, будзе зроблен паказальны працэс, але трактар з строю пакуль выбыў.

У дзень агляду самой Сеньненскай МТС 28 сакавіка старшы рулявы заяжджае з трактарам у яму, абломлівае важную частку корпусу і такім чынам выводзіцца з строю ўжо другі трактар. Тут злачынная нядбайнасьць, няўважлівасьць да даручанай справы.

Такія зьявішчы неабходна зьнішчыць. Трэба змагацца з нядбайнымі адносінамі да машыны.

«Тут Райком гаспадар!..». Так адказвае загадчык аргаддзелу Сеньненскага Райкому на пратэст інспэктара Трактарацэнтру адносна мабілізацыі Райкомам інструктара аргмасавай работы МТС на розныя кампаніі не па лініі МТС. Такая ўстаноўка ідзе ўразрэз з партыйнымі дырэктывамі аб тым, каб не адрываць работнікаў МТС ад іх непасрэднай работы.

Здавальняюча праходзіць у Дубровенскай МТС толькі падрыхтоўка трактарыстаў і трактарыстак. Калгасьнікі і калгасьніцы пасьпяхова вывучаюць тэхніку. Падрыхтоўка гэтых кадраў сапраўды вядзецца па-ўдарнаму.

Гэты беглы агляд ходу падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны ў двух толькі раёнах, дзе ёсьць МТС, павінен сыгналізаваць і папярэдзіць падобныя непаладкі і прарывы і ў астатніх раёнах, дзе будаўніцтва МТС цесна зьвязана з задачай суцэльнай калектывізацыі.

Ад чоткай і бесьперапыннай работы МТС, ад наладжанай работы і ўвагі да МТС раённых кіруючых арганізацый, залежыць далейшы рост калгаснага руху і пасьпяховая перабудова сельскае гаспадаркі на тэхнічнай базе.

Брандабоўскі.

Линейная калибровочная мишень LR-BE4-V2

Новы закон пра сельгаспадатак—у масы!

НА ЗАМАЦАВАНЬНЕ БАЛЬШАВІЦКІХ ТЭМПАЎ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ!

Закон пра сельгаспадатак зьяўляецца магутным падважнікам у арганізацыі новага прыліву ў калгасы, у барацьбе за суцэльную калектывізацыю і на яе аснове ліквідацыю кулацтва як клясы

Пра адзіны сельска-гаспадарчы падатак на 1931 г.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

У адпаведнасьці з палажэньнем пра адзіны сельска-гаспадарчы падатак, на 1931 г., зацьверджаным ЦВК і СНК СССР 29 сакавіка 1931 г. (газ. «Известия ЦИК СССР и ВЦИК» за 1931 г., № 88) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляюць:**

1. Калгасам, якія выканаюць вытворчыя зданьні па пасеву, апрацоўцы і ўборцы, даецца 10 проц. скідка з налічанай сумы падатку.

2. Устанавіць для калгасаў наступныя тэрміны выплаты сельска-гаспадарчага падатку: да 1-га лістапада 1931 г.—50 проц. акладу; да 1-га сьнежня 1931 г.—50 проц. акладу.

3. Даходы ад паляводства вызначаць па пахаці, гэта значыць, выходзячы з агульнай плошчы ворнай зямлі гаспадаркі незалежна ад таго засеяна яна, ці не, ва ўсіх раёнах, апроч наступных раёнаў:

Лоеўскага, Асіпавіцкага, Азарыцкага, Жыткавіцкага, Мазырскага, Ельскага, Капаткевіцкага, Лельчыцкага, Нараўлянскага, Пятрыкоўскага, Тураўскага, Юравіцкага і Чачэвіцкага, у якіх даходы ад паляводства вызначаць па пасеву, г. зн., выходзячы з плошчы сапраўды засеянай зямлі у гаспадарцы.

4. Устанавіць для раёнаў наступныя нормы даходаў, якія абкладаюцца с.-г. падаткам:

РАЁНЫ	Нормы абкладаемага даходу ў рублёх: На 1 гэктар: Пахаці	Пасеў	Лугу заліўнога	Лугу незаліўнога	Гароду	Саду	На 1 штуку: Коней старэй 4 год	Быкоў і нецеляў старэй 3 год і кароў	Валоў старэй 4 год	Перазімаваўшых авечак і коз
1. Азарыцкі	—	49	24	19	155	175	20	16	14	1 р. 80 к.
2. Аршанскі	39	—	28	18	215	245	25	23	15	1 р. 80 к.
3. Асіпавіцкі	—	53	31	19	205	255	25	20	15	1 р. 80 к.
4. Асьвейскі	34	—	27	16	215	185	24	17	15	1 р. 80 к.
5. Бабруйскі	41	—	31	19	210	285	25	22	15	1 р. 80 к.
6. Багушэўскі	38	—	28	17	215	245	25	20	15	1 р. 80 к.
7. Барысаўскі	38	—	29	19	215	225	24	22	15	1 р. 80 к.
8. Бешанковіцкі	35	—	24	1	170	195	26	21	15	1 р. 80 к.
9. Брагінскі	43	—	33	20	180	205	25	22	15	1 р. 80 к.
10. Буда-Кашэл.	41	—	33	20	190	205	25	22	15	1 р. 80 к.
11. Быхаўскі	43	—	36	19	215	270	25	22	15	1 р. 80 к.
12. Бягомльскі	32	—	27	17	155	165	19	18	15	1 р. 80 к.
13. Белынецкі	38	—	31	19	215	270	25	20	15	1 р. 80 к.
14. Бярэзінскі	39	—	29	19	180	185	23	22	15	1 р. 80 к.
15. Боркавіцкі	37	—	27	17	215	185	24	19	15	1 р. 80 к.
16. Віцебскі	42	—	31	19	280	285	28	28	15	1 р. 80 к.
17. Веткаўскі	41	—	36	21	190	210	25	23	15	1 р. 80 к.
18. Ветрынскі	35	—	27	18	215	185	24	19	15	1 р. 80 к.
19. Вульскі	35	—	27	17	215	185	24	16	15	1 р. 80 к.
20. Вушацкі	35	—	27	17	215	185	24	19	15	1 р. 80 к.
21. Высачанскі	42	—	29	18	225	245	28	26	15	1 р. 80 к.
22. Гарадоцкі	35	—	24	18	225	245	27	24	15	1 р. 80 к.
23. Глускі	39	—	36	19	195	255	25	20	15	1 р. 80 к.
24. Гомельскі	42	—	34	21	205	225	25	26	15	1 р. 80 к.
25. Горацкі	39	—	28	18	215	245	25	22	15	1 р. 80 к.
26. Грэскі	45	—	26	18	225	255	26	24	14	1 р. 80 к.
27. Дубровенскі	37	—	28	17	215	245	25	20	15	1 р. 80 к.
28. Дрыбінскі	38	—	28	18	215	245	25	20	15	1 р. 80 к.
29. Дрысенскі	36	—	27	17	215	185	24	19	15	1 р. 80 к.
30. Ельскі	—	50	28	20	155	175	24	17	16	1 р. 80 к.
31. Жлобінскі	41	—	36	19	205	285	25	22	15	1 р. 80 к.
32. Журавіцкі	39	—	33	19	215	270	25	20	15	1 р. 80 к.
33. Жыткавіцкі	—	47	27	19	155	175	22	17	14	1 р. 80 к.
34. Заслаўскі	42	—	29	22	240	270	26	25	15	1 р. 80 к.
35. Камарынскі	37	—	36	20	170	195	25	22	15	1 р. 80 к.
36. Капыльскі	49	—	24	18	225	260	30	28	16	1 р. 80 к.
37. Капаткевіцкі	—	49	24	18	155	175	23	17	14	1 р. 80 к.
38. Кармянскі	38	—	33	19	215	270	25	20	15	1 р. 80 к.
39. Касьцюковіцкі	38	—	28	19	215	270	26	[illegible]	15	1 р. 80 к.
40. Копыскі	41	—	28	19	215	245	25	23	15	1 р. 80 к.
41. Коханаўскі	40	—	28	19	215	245	25	22	15	1 р. 80 к.
42. Койданаўскі	43	—	29	22	215	270	27	24	15	1 р. 80 к.
43. Клічаўскі	38	—	33	19	195	255	25	20	15	1 р. 80 к.
44. Клімавіцкі	38	—	28	19	215	270	25	20	15	1 р. 80 к.
45. Краснапольскі	35	—	28	19	215	270	25	20	15	1 р. 80 к.
46. Крупскі	36	—	28	17	215	245	25	20	15	1 р. 80 к.
47. Круглянскі	41	—	28	18	215	245	25	22	15	1 р. 80 к.
48. Крычаўскі	39	—	33	19	215	270	25	22	15	1 р. 80 к.
49. Лагойскі	40	—	26	18	175	225	24	22	14	1 р. 80 к.
50. Лельчыцкі	—	47	24	18	155	175	23	16	15	1 р. 80 к.
51. Лепельскі	34	—	27	17	215	185	24	19	15	1 р. 80 к.
52. Лёзьнянскі	43	—	30	19	225	245	28	28	15	1 р. 80 к.
53. Лоеўскі	—	58	36	20	170	195	25	22	15	1 р. 80 к.
54. Любанскі	41	—	24	18	205	255	25	20	15	1 р. 80 к.
55. Ліднянскі	37	—	28	18	215	245	25	20	15	1 р. 80 к.
56. Магілеўскі	42	—	36	19	215	270	25	24	15	1 р. 80 к.
57. Мазырскі	—	51	30	20	155	175	23	19	15	1 р. 80 к.
58. Межанскі	37	—	26	17	170	195	27	22	15	1 р. 80 к.
59. Менскі	50	—	32	22	250	290	29	29	15	1 р. 80 к.
60. Мсьціслаўскі	43	—	28	18	215	245	27	22	15	1 р. 80 к.
61. Нараўлянскі	—	49	29	19	155	175	24	17	16	1 р. 80 к.
62. Парыцкі	37	—	31	19	195	255	25	20	15	1 р. 80 к.
63. Петрыкоўскі	—	51	29	20	155	175	23	17	16	1 р. 80 к.
64. Плешчаніцкі	32	—	27	17	155	210	20	19	15	1 р. 80 к.
65. Полацкі	36	—	27	18	215	185	24	21	15	1 р. 80 к.
66. Прапойскі	38	—	33	19	215	270	25	20	15	1 р. 80 к.
67. Пухавіцкі	42	—	27	21	240	270	26	24	16	1 р. 80 к.
68. Рагачоўскі	41	—	36	19	205	285	25	22	15	1 р. 80 к.
69. Расьнянскі	38	—	28	18	215	245	25	20	15	1 р. 80 к.
70. Расонскі	34	—	27	17	215	185	24	19	15	1 р. 80 к.
71. Рэчыцкі	40	—	36	20	195	210	25	22	15	1 р. 80 к.
72. Сененскі	37	—	28	18	170	195	27	22	15	1 р. 80 к.
73. Сіроцінскі	36	—	24	18	225	245	27	22	15	1 р. 80 к.
74. Слуцкі	50	—	29	18	210	285	31	28	15	1 р. 80 к.
75. Смалявіцкі	42	—	27	20	205	255	25	23	15	1 р. 80 к.
76. Ст. Дароскі	37	—	24	18	205	255	25	20	15	1 р. 80 к.
77. Старобінскі	40	—	24	18	205	255	25	19	15	1 р. 80 к.
78. Сураскі	41	—	28	18	225	245	27	25	15	1 р. 80 к.
79. Сьвіславіцкі	39	—	31	19	205	255	25	20	15	1 р. 80 к.
80. Сьмілавіцкі	43	—	28	20	205	255	26	24	15	1 р. 80 к.
81. Талачынскі	41	—	28	18	215	245	25	22	15	1 р. 80 к.
82. Тураўскі	—	55	28	18	155	175	23	17	15	1 р. 80 к.
83. Уваравіцкі	42	—	36	21	195	210	25	24	15	1 р. 80 к.
84. Узьдзенскі	41	—	27	18	175	225	25	22	14	1 р. 80 к.
85. Халопеніцкі	33	—	27	18	155	165	20	19	15	1 р. 80 к.
86. Хоцімскі	39	—	28	19	215	270	25	22	15	1 р. 80 к.
87. Хойніцкі	42	—	33	20	195	210	25	22	15	1 р. 80 к.
88. Цэрахаўскі	39	—	30	20	190	180	25	22	15	1 р. 80 к.
89. Чаўскі	41	—	33	19	215	270	25	22	15	1 р. 80 к.
90. Чарэйскі	36	—	28	17	215	245	25	19	15	1 р. 80 к.
91. Чачэрскі	42	—	36	20	190	210	25	20	15	1 р. 80 к.
92. Чачэвіцкі	—	52	31	19	215	270	25	20	15	1 р. 80 к.
93. Чашніцкі	34	—	26	17	170	195	26	20	15	1 р. 80 к.
94. Чэрвенскі	41	—	24	18	175	225	25	23	15	1 р. 80 к.
95. Чэрыкаўскі	37	—	33	19	215	270	25	20	15	1 р. 80 к.
96. Чырв. Слаб.	47	—	24	18	205	285	31	24	15	1 р. 80 к.
97. Шклоўскі	43	—	36	19	215	270	25	22	15	1 р. 80 к.
98. Юравіцкі	—	54	32	20	155	175	24	19	15	1 р. 80 к.

5. У наступных раёнах прамысловага масларобства: Горацкім, Жлобінскім, Рагачоўскім, Віцебскім, Гарадоцкім, Лёзьнянскім, Высочанскім, Гомельскім, Магілеўскім, Копыльскім, Менскім, Боркавіцкім і Нараўлянскім у даходы ад кароў і быкоў у гаспадарках, якія заключылі кантрактацыйныя дагаворы аб здачы прадукцыі жывёлагадоўлі абкладаюцца сельскагаспадарчым падаткам са скідкаю ў 50 проц. у параўнаньні з нормамі, устаноўленымі для адпаведных паселішчаў.

6. Даход ад плошчаў, занятых пасевамі лёну і канапель, налічваецца па ўсіх раёнах з палавіннаю скідкаю з норм даходнасьці, устаноўленых для палявых зямель.

7. Даходы ад неземляробчых заработкаў уключаюцца ў абкладаемы сельскагаспадарчым падаткам даход у наступных разьмерах: а) заработная плата работнікаў, якія стала жывуць у сваёй сельскай гаспадарцы, у разьмеры 15 проц.; б) заработная плата работнікаў, якія стала жывуць па-за сваёй сельскаю гаспадаркаю, ў разьмеры 10 проц.; в) плата, якая атрымліваецца на адходных промыслах за работу па найму, у разьмеры 20 проц.; г) даходы, атрыманыя ад адходных промыслаў, не па найму, у разьмеры 40 проц.; д) даход, атрыманы ад саматужных, рамесных і іншых заработкаў без нанятых рабочых, у разьмеры 50 проц.

Для каапэраваных саматужнікаў і рамесьнікаў, якія не карыстаюцца нанятаю працаю, вылічаны такім чынам даход паніжаецца на чвэрць: льгота гэта пашыраецца толькі на тых саматужнікаў і рамесьнікаў, якія зьяўляюцца членамі таварыстваў, што ўваходзяць у каапэрацыйную сыстэму.

8. Гаспадаркі лічацца кулацкімі і абкладаюцца сельскагаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку, калі ёсьць адна ці некалькіх з наступных адзнак:

а) калі ў гаспадарцы сыстэматычна ўжываецца нанятая рабочая сіла для сельскагаспадарчых работ больш 30 рабочых дзён у год.

Па гэтай адзнацы не абкладаюцца сельскагаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку гаспадаркі, якія ўжываюць нанятую рабочую сілу і больш 30 рабочых дзён у год, альбо ня больш аднаго сталага рабочага пры наступных акалічнасьцях: хвароба, мабілізацыя, прызыў у РСЧА, выбары на грамадзкую пасаду, якая патрабуе адрыва ад гаспадаркі, удовы з малымі дзецьмі на ўвесь час данага становішча гаспадаркі, а таксама гаспадаркі, члены якіх адыходзяць на сэзонную работу, а гаспадарка з гэтае прычыны ўжывае на перыяд адыходу на сэзонную работу нанятую рабочую сілу, ня больш аднаго рабочага;

б) калі ў сельскай гаспадарцы ёсьць саматужна-прамысловае прадпрыемства і ў ім ужываецца нанятая рабочая сіла незалежна ад разьмеру.

Неабкладаюцца сельскагаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку тыя гаспадаркі, саматужна-прамысловыя прадпрыемствы якіх па асаблівых умовах вытворчасьці, ужываюць ня больш аднаго дарослага рабочага або двух вучняў (напр.; малатабоец у каваля);

в) калі ў гаспадарцы ёсьць млын незалежна ад колькасьці паставаў, маслабойка, крупадзёрка, просадзёрка, воўначоска, воўнабітка, цёрачнае прадпрыемства, сушня бульбы, садавіны ці гародніны, альбо іншыя прамысловыя прадпрыемства пры ўмове ўжываньня ў пералічаных прадпрыемствах або мэханічнага рухавіка, або сілы ветру ці вады, або конока-цягавой сілы, або, калі гэтыя прадпрыемствы працуюць пераважна па скупліваемай сыравіне.

Калі ў гаспадарцы ёсьць адно з пералічаных прадпрыемстваў без мэханічнага рухавіка, дык гэта зьяўляецца адзнакаю для індывідуальнага абкладаньня пры ўмове, калі даход з гэтага прадпрыемства за год складае больш 150 руб.

Калі-ж у гаспадарцы ёсьць некалькі з пералічаных прадпрыемстваў, дык гэта зьяўляецца адзнакаю для індывідуальнага абкладаньня, хаця ў даных прадпрыемствах няма паказаных вышэй умоў;

г) калі гаспадарка мае або арандуе прамысловае прадпрыемства, якім эксплёатуе насельніцтва праз здачу тых, або іншых работ на дом, або праз здачу гэтага прадпрыемства ў арэнду ці субарэнду;

д) калі гаспадарка дае ў наймы сельскагаспадарчыя машыны з мэханічным рухавіком, альбо за плату праводзіць работу з гэтымі машынамі для іншых гаспадарак, а таксама калі гаспадарка, эксплёатуе складаныя сельскагаспадарчыя машыны і без мэханічнага рухавіка але даход ад эксплёатацыі гэтых машын за год правышае 150 руб.;

е) калі гаспадарка дае ў карыстаньне ваколічнаму насельніцтву рабочую жывёлу на ўмовах, прызнаных раённаю падатковаю камісіяй кабальнымі;

ж) калі гаспадарка дае або арандуе для гандлёвай ці прамысловай эксплёатацыі сад ці гарод больш 0,5 гектараў у сельскіх мясцовасьцях, ці 0,25 гект. у гарадох;

з) калі гаспадарка сыстэматычна здае ў наймы памяшканьне пад жыльлё, ці прадпрыемства, або спэцыяльнае памяшканьне пад дачу і сума арэнднай платы за год перавышае 150 руб.

Калі-ж гаспадарка здае памяшканьне пад школы, лікпункты, хаты-чытальні і інш. дзяржаўныя ці грамадзкія ўстановы, дык гэтыя гаспадаркі не абкладаюцца сельскагаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку, калі ў іх няма іншых адзнак з пералічаных у гэтым артыкуле;

і) калі члены гаспадаркі займаюцца гандлем па рэгістрацыйным пасьведчаньні, або без яго (скупкаю—перапрадажам сельскагаспадарчых прадуктаў і іншых рэчаў), кватніцтвам, (пазычаньне грошай ці іншых рэчаў на процанты, альбо на адработак), ці маюць іншыя непрацоўныя даходы, у тым ліку служнікі рэлігійных культаў;

к) калі гаспадарка арандуе вадазборы для рыбнай лоўлі;

л) калі ў гаспадарцы ёсьць даходы ад эксплёатацыі ўласнай ці арэндаванай лайбы і атрымоўваемы за год даход перавышае 150 руб.;

м) калі гаспадарка бярэ на пашу за плату чужую жывёлу і атрыманая за гэта плата перавышае за год 150 руб.

Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты, Менскі, Віцебскі і Гомельскі гарадзкія саветы ўстанавіць пільны нагляд за тым, каб ні ў якім разе не дапускалася абкладаньня ў індывідуальным парадку серадняцкіх гаспадарак. Вінаватыя ў парушэньні гэтага правіла павінны прыцягвацца да суровай адміністрацыйнай альбо судовай адказнасьці.

9. Устанавіць наступныя тэрміны для выплаты калгасьнікамі па іх неаграмаджаных даходах і аднаасобнымі гаспадаркамі сельгаспадарчага падатку:
да 1. верасьня 1931 г. 30 проц. акладу
да 15 кастр. 1931 г. 50 »
да 1 сьнежня 1931 г. 20 »

Усе гаспадаркі абкладзеныя ў індывідуальным парадку, павінны заплаціць усе 100 проц. падатку да 1-га верасьня 1931 году.

10. Для падліку платнікаў сельскагаспадарчага падатку і крыніц іх даходаў і для разгляду скаргаў па сельскагаспадарчым падатку, арганізуюцца сельскія падатковыя камісіі ў складзе: старшыні камісіі—старшыні сельскага савету і членаў камісіі: старшыня камітэту ўзаемадапамогі, прадстаўнік калгасаў, прадстаўнік групы беднаты, прадстаўнік сэкцыі РСІ і член сельскага савету з таго паселішча або вучастку, дзе праводзіцца падлік аб'ектаў абкладаньня, або справы якога разглядаюцца ў камісіі.

11. Налічэньне абкладаемага даходу і акладаў сельска-гаспадарчага падатку па ўсіх гаспадарках, апроч калгасаў, складаньне і ўручэньне акладных лістоў ускладаецца на раённыя выканаўчыя камітэты. Раённым выканаўчым камітэтам даецца права, калі яны знойдуць магчымым, ускласьці гэтую працу на асобныя сельскія саветы.

12. У раёнах арганізуюцца раённыя камісіі па сельска-гаспадарчым падатку ў складзе старшыні камісіі—загадчык раённага фінансавага аддзелу і членаў камісіі: загадчык раённага зямельнага аддзелу і прадстаўнікоў: раённай пракуратуры, раённай РСІ, раённага калгасаюзу, раённага прафсавету і раённага камітэту Т-ва ўзаемадапамогі. На раённыя камісіі ўскладаюцца абавязкі паказаныя ў арт. арт. 8, 50, 53, 86, 92 і 93 палажэньня пра сельска-гаспадарчы падатак на 1931 год.

13. Усім платнікам сельска-гаспадарчага падатку акладныя лісты павінны быць уручаны не пазьней 1-га жніўня 1931 г.

14. Прапанаваць усім раённым выканаўчым камітэтам Менскаму, Віцебскаму і Гомельскаму, гарадзкім саветам не пазьней 10 красавіка г.г.: а) устанавіць і апублікаваць нормы даходнасьці для паасобных сельскіх саветаў і ў асобных выпадках для паасобных паселішчаў, выходзячы з раённых норм, паказаных у арт. 4 гэтай пастановы; б) вырашыць пытаньне, якое вынікае з увагі першай да арт. 28 палажэньня пра сельска-гаспадарчы падатак, пра прыцягненьне да абкладаньня сельска-гаспадарчым падаткам інш. спэцыяльных галін не прадугледжаных арт. 4 гэтае пастановы, устанаўшы ў адпаведных выпадках для іх спэцыяльныя нормы даходнасьці; в) па раёнах, на тэрыторыі якіх ёсьць гарады альбо мястэчкі гарадзкога тыпу, апроч гэтага ўстанавіць і апублікаваць парадак абкладаньня сельска-гаспадарчым падаткам грамадзян, якія займаюцца сельскай гаспадаркай па гарадзкіх землях, у адпаведнасьці з арт. 30 і 86 палажэньня пра сельска-гаспадарчы падатак, пры чым прадугледзець што тыя з грамадзян, якія будуць абкладзены сельска-гаспадарчым падаткам павінны выплачваць яго па даходах ад сельскай гаспадаркі, а таксама і ад неземляробчых заработкаў.

15. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам, гарадзкім і сельскім саветам безадкладна разгарнуць шырокую агітацыйна-растлумачальную кампанію па папулярызацыі новага закону, асабліва растлумачыўшы льготы ўстаноўленыя для калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

16. Даручыць Народнаму Камісарыяту Фінансаў не пазьней 25 красавіка г. г. выдаць інструкцыю аб парадку ажыцьцяўленьня закону пра сельскагаспадарчы падатак.

17. У зьвязку з выданьнем гэтае пастановы скасаваць пастанову ЦВК і СНК БССР за 19 сакавіка 1930 г. «пра адзіны сельска - гаспадарчы падатак» (З. З. БССР 1930 г., № 17, паст. 116) і пастановы ЦВК і СНК БССР за 31 сьнежня 1930 г. «Пра адзнакі кулацкіх гаспадарак» (З. З. БССР 1931 г. № 3, паст. 19).

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гілякевіч.**

6 красавіка 1931 г.
Гор. Менск.

ЗАКОНЫ І ПАСТАНОВЫ УРАДУ БССР

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб перайменаваньні Бокаўскага сельскага савету ў Каменскі сельскі савет.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **пастанаўляе:**

Перайменаваць Бокаўскі сельсавет, Ельскага раёну, ў Каменскі сельскі савет.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гілякевіч.**

1 красавіка 1931 г.
гор. Менск.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб перадачы вёскі Вярхоўе з Мазырскага ў Завячэльскі сельскі савет.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **пастанаўляе:**

Перадаць вёску Вярхоўе, Вушацкага раёну, з Мазырскага ў Завячэльскі сельскі савет.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гілякевіч.**

1 красавіка 1931 г.
гор. Менск.

ТЭАТР-КІНО

Беларускі Другі Дзярж. тэатр	Сёньня адкрыты спэктакль. **1-я КОННАЯ** Пачатак а 8 гадз. увечары.

З ПАНЯДЗЕЛКА 6-га КРАСАВІКА

„Чырвоная Зорка"	Новы савецкі фільм ГОСЬЦЬ З МЭКІ Пачатак а 7 г., 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. Каса адч. з 5 г.
Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"	Гістарычны фільм ЛЕДЗЯНЫ ДОМ Нач. 1 сэансу а 6 гадз. Каса адч. з 4 г.
Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"	У лепш. комэд. Монці Бэнкс ЛЁТАЮЧАЕ ШЧАСЬЦЕ Пач. 1 сэансу а 6 гадз. Каса адч. з 4 гадз.
Кіно „Юны Піянэр"	2-гі тыдзень АБРЭК ЗАУР Пачат. сэансу а 1 г. дню. Каса адч. з 11 г. 30 хв.

Усебеларуская Кантора Дзяржбанку

даводзіць да ведама сваёй кліентуры, што

для палягчэньня пераходу да новай формы разьлікаў, з 7-га КРАСАВІКА па 1-е МАЯ 1931 г. устанаўляецца наступны парадак **АДНАГАРОДНІХ** разьлікаў паміж Гаспорганамі маючымі кантакарэнты ў адным горадзе:

1. Рахункі прадстаўляюцца банку як раней пастаўшчыком, але **ПА МЕСЦЫ ЗНАХОДЖАНЬНЯ КАНТАКАРЭНТА ПАКУПЦА** (у к-ру, альбо Менскаму Аддз. Дзяржбанку).

2. Аплата рахункаў вытвараецца без патрабаваньня акцэпту толькі ў поўнай суме рахунку і **ВЫКЛЮЧНА Ў МЕЖАХ ВОЛЬНАГА ЛІМІТУ ПАКУПЦА.**

3. У выпадку адсутнасьці ў пакупца ліміту, рахункі будуць зварочвацца пастаўшчыку без аплаты.

Бел. Кантора Дзяржбанку.

Аршанскае раённае спажывецкае таварыства „ЧЫРВОНЫ АРАТАЙ" ЛІКВІДУЕЦЦА

з 1 красавіка 1931 г.

Асобы і ўстановы, маючыя прэтэнзіі да „Чырвонага Аратага", павінны заявіць іх ліквідкаму ў месячны тэрмін, пасьля чаго ўсялякі прыём прэтэнзій спыняецца.

Уклады, паі і мэтавыя (на будаўніцтва) перадаюцца на балянсу новым арганізаваным пры кожным сельсавеце спажывецкім таварыствам, якія з 1 красавіка і будуць рабіць усе апэрацыі па прыёме і выдачы укладаў, авансу, паёў і мэтавых.

Ліквідком „Чырвонага Аратага".

Ад Беларускай Канторы Дзяржбанку.

Усім дзяржаўным і каапэрацыйным арганізацыям, прадпрыемствам і ўстановам,

якія знаходзяцца на гаспадарчым разьліку.

Згодна пастановы СНК СССР ад 14-I і 20-III 1931 г. з 1 мая г. г. ДЗЯРЖБАНК ПЕРАХОДЗІЦЬ ДА

НОВЫХ ФОРМ

КРЭДЫТНА-РАЗЬЛІКОВЫХ АПЭРАЦЫЙ

З КЛІЕНТУРАЙ.

У мэтах сваячасовага інструктажу і ўсвоеньня тэхнікі разьлікаў у новых умовах, усім гаспадарчым органам і ўстановам належыць безадкладна атрымаць ад сваіх ведамстваў і аб'яднаньняў неабходныя інструкцыйныя матар'ялы наконт гэтага і забясьпечыць свае апэрацыйныя часткі новымі формамі блянкаў, рахункаў-фактур, рэестраў і інш. дапаможнымі матар'яламі, неабходнымі з 1-V г. г. для бесьперапыннага правядзеньня праз дзяржбанк крэдытна-рахунковых апэрацый на новых падставах.

У адпаведнасьці з пунктамі 1—7-м (разьдзел III) пастановы СНК СССР ад 20-III г. г. усе абласныя і мясцовага значэньня гаспадарчыя арганізацыі і прадпрыемствы абавязаны прадставіць **не пазьней 25 красавіка г. г.** ва ўстановы дзяржбанку па месцы знаходжаньня іх кантакарэнтных рахункаў свае балянсы па становішчы на 1-X 1930 г. на 1-I і на 1-IV 1931 г. і, акрамя гэтага, копіі заключаных дагавароў і згод па пастаўкам тавараў і інш. матар'яльных каштоўнасьцяй вытварэньня работ і па аказаньні паслуг, характарызуючых аб'ём і тэрміны гэтых апэрацый у каштоўным выразе.

УВАГА: Аб'яднаньні і Трэсты саюзнага і рэспубліканскага значэньня, маючыя к.-к. рахункі ў Беларускай Канторы Дзяржбанку, патрабуемыя вышэй зьвесткі прадстаўляюць да таго-ж тэрміну адведным сэктарам КІІК Праўленьня Дзяржбанку.

Згодна закону ад 14-I, **Дзяржбанк ня будзе аплачваць** рахункі фактуры ніжэй 1.000 рублёў; рахункі па згодах на суму ніжэй 1.000 рублёў падлягаюць аплаце ў парадку пераводаў наложаным плацяжом, разьліковымі імяннымі чэкамі і плацежнымі даручэньнямі, а таму ў выпадку прадстаўленьня рахункаў-фактур ніжэй 1.000 рублёў для аплаты непасрэдна ў банк разьлікі па ім вытварацца ня будуць.

Беларуская Кантора Дзяржбанку

ПАПЯРЭДЖВАЕ, што за перабой у крэдытаваньні з-за адсутнічаньня неабходных новых форм бляннкаў, рахункаў-фактур, рэестраў і інш., а таксама ў выніку непрадстаўленьня банку **сваячасова балянсу і зьвестак аб дагаворах і згодах,**— адказнасьць ускладаецца на гаспадарчыя арганізацыі, прадпрыемствы і ўстановы непасрэдна.

БЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ

Па-баявому змагацца за ліквідацыю прарываў на радыё-фронце

Абследваньне НК РСІ БССР з удзелам шырокіх рабочых мас і актыву радыёцэнтру паказала, што сучаснае становішча радыёфікацыі ў БССР і радыё-сувязі нездавальняючае і адстае ад тэмпаў агульнага разьвіцьця народнае гаспадаркі. Абсьледваньне выявіла, што дырэктывы партыі і ўраду аб радыёфікацыі выкананы ня поўнасьцю. Радыёсавет бязьдзейнічаў і не кіраваў радыё-справай, як у цэнтры, так і па раёнах. У справе радыёфікацыі адсутнічае плянавасьць, няма вучоту матар'ялу, маюцца шкодніцкія адносіны да радыёфікацыі з боку канторы забесьпячэньня, што выявілася ў хлусьлівых зьвестках аб наяўнасьці радыё-матар'ялаў. Нядбайныя адносіны асобных працаўнікоў радыё-сэктару прывялі да прарыву на фронце радыёфікацыі БССР.

Абсьледваньне выявіла нездавальняючую пастаноўку беларускай радыёгазэты і іншых аддзел радыёгазэт. Зусім мала скарыстоўваліся ў радыё-газэтах матар'ялы рабселькораў і наогул радыёрабселькоры слаба ўцягваліся ў радыёгазэты. Трэба адзначыць, як вялікі недахоп тое, што зусім недастаткова перадач на мове нацменшасьцяй. Слаба ахоплены рабочыя, калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы вучобай праз радыё-унівэрсытэт. Наогул трэба сказаць, што кампанія па вярбоўцы слухачоў у радыё-унівэрсытэт правалена.

Наркамасьветы зусім слаба кіруе працай радыёцэнтру. Маецца таксама недаацэнка радыё-працы з боку некаторых партыйных, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый. У справе радыёфікацыі радыёцэнтр мае буйныя прарывы. Так, па БССР трэба было ўстанавіць 16.000 радыёпунктаў, фактычна ўстаноўлена толькі 10.000 пунктаў. У Барысаўскім раёне паводле пляну павінна быць 1.000 радыёпунктаў, а маецца толькі 296, у Лёзьнянскім замест 250—толькі 37, у Гарадокскім замест 350—усяго 41, у Магілеўскім замест 1.000 толькі 227, у Менскім замест 1.700—ёсьць 837, у Плешчаніцкім замест 350—радыёпунктаў устаноўлена ўсяго 82 і г. д. Прычыны гэтага прарыву — адсутнічаньне кіраўніцтва і бяссыстэмнасьць у правядзеньні радыфікацыі.

Выезды працаўнікоў радыё-цэнтру ў раёны амаль зусім адсутнічалі, а калі хто і выяжджаў, дык ніякай дапамогі мясцом не аказваў. Абследваньне радыё-вузлаў і дапамога радыё-пунктам адсутнічала. Цяпер будзе зусім зразумела чаму ў шмат якіх мясцох на фабрыках, заводах, у саўгасах, калгасах, школах, і хатах-чытальнях гучна-гаварыцелі ператварыліся ў радыё-маўчацелі.

Усе гэтыя недахопы тлумачацца тым, што сярод асобных працаўнікоў радыё-цэнтру няма ініцыятывы, няма зацікаўленасьці, не разьвіта сацспаборніцтва і ўдарніцтва на лепшае абслугоўваньне рабочых і працоўных мас.

Мы ведаем, што радыё-прылады зьяўляюцца дэфіцытным таварам. Між тым, на складзе Белкаапсаюзу ляжыць вялікі запас розных радыё-прылад, які можна было-б па дагаворанасьці з Белкаапсаюзам кінуць на ліквідацыю прарываў на мясцох. Склад радыё-цэнтру таксама завалены радыё-апаратамі і іншымі прыладамі. Так, аднаго дроту маецца 36 тон, не распакавана розных радыё-прылад 200 скрынак. Ня так даўно было атрымана 2 вагоны розных прылад для ажыцьцяўленьня пляну радыёфікацыі, але ўсё гэта ляжала бяз руху.

Майстэрня пры радыёцэнтры зусім слаба забясьпечана памяшканьнем. Асобныя працаўнікі нядбайна адносяцца да вытворчасьці і выпускаюць з майстэрні недобразякасную прадукцыю. Вытворчага пляну ў майстэрні няма, адсутнічае і плянавае забесьпячэньне яе радыё-матар'яламі. Рабочыя майстэрні не абгаворваюць асноўных

Новы трансляцыйны радыё-вузел у Воршы.

пытаньняў вытворчасьці. Вытворчыя нарады ня склікаюцца. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў майстэрнях не разгорнута.

Асноўнай газэтай радыё-цэнтру зьяўляецца «Беларуская радыё-газэта», а астатнія газэты выходзяць нерэгулярна. «Беларуская радыё-газэта» больш-менш здавальняюча асьвятляе і рэагуе на ўсе важнейшыя пытаньні міжнароднай і ўнутраной палітыкі СССР.

Большасьць вакальных нумароў выконваецца на расійскай мове, рэпэртуар беларускіх сьпеваў не абнаўляецца рэвалюцыйнай песьняй. Так, сьпявачка Александроўская да гэтага часу ў сваім рэпэртуары ня мае рэвалюцыйных сьпеваў.

Працоўная дысцыпліна працаўнікоў аркестру не на належнай вышыні. Радыё-савет, як адзначалася вышэй, бязьдзейнічае і зусім слаба дапамагае радыё-цэнтру. Цэнтральны Савет Т-ва прыхільнікаў радыё ня мае ні пляну працы, ні вучоту ячэек т-ва.

Калегія НК РСІ абгаварыла вынікі работы па абсьледваньні і ў сваёй пастанове адзначыла недапушчальна слабыя тэмпы ў разгортваньні справы радыёфікацыі. Радыё-цэнтру прапанавана да 15 ліпеня ліквідаваць усе прарывы на радыёфронце і зьвярнуць асаблівую ўвагу на радыёфікацыю буйных прамысловых цэнтраў, саўгасаў і калгасаў. Канторы забесьпячэньня прапанавана асобных працаўнікоў за нядбайнасьць да справы прыцягнуць да судовай адказнасьці. Дадзена таксама рад практычных дырэктыў па аздараўленьні радыёабслугоўваньнем рабочых калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас.

А. Фандарэнка.
А. Сьцефановіч.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

ГарКК і рэдакцыя газэты «Рабселькор» напамінае ўсім таварышам, якія ўдзельнічалі ў «рэйдзе» па масавай праверцы стану і разгортваньня самакрытыкі і рэагаваньня», аб неабходнасьці тэрмінова здаць вынікі рэйду ў пісьмовай форме ў рэдакцыю газэты «Рабселькор» (Савецкая вул. 63 другі паверх).

Рэдакцыя газ. «Рабселькор». ГарКК.

ДОМ АСЬВЕТЫ

Сёньня 7-IV—г. г. роўна а 7-й гадз. увечары адбудзецца адчынены сход цэх. ячэек КП(б)Б школьнай і дашкольнай.

На абвестцы дню: Справаздачы Бюро ячэек аб праробленай працы.

Запрашаюцца асьветнікі г. Менску.

Рабселькораў на нараду

Краснапольскі РК КП(б)Б і Рай КК РСІ склікаюць на панядзелак 13 красавіка г. г. а 10 гадзіне раніцы ў м. Краснапольлі раённую нараду рабселькораў з наступным парадкам дню:

1. Вынікі Ўсесаюзнай рабселькораўскай нарады і задачы рабселькораў у 3-м рашаючым годзе пяцігодкі.
2. Аб рэагаваньні на рабселькораўскія заметкі і ўдзел рабселькораў у рабоце органаў РСІ.

Просьба да ўсіх рабкораў, селькораў, юнкораў, сценкораў, і членаў рэдкалегій насьценгазэт Краснапольскага раёну сваячасова зьявіцца на нараду ў памяшканьне Нардому.

РК КП(б)Б і РКК-РСІ.

ЦП Белпрацасьветы прапануе ўсім беспрацоўным, якія знаходзяцца на вучоце пры ЦП і не прайшлі перарэгістрацыю ў красавіку месяцы г. г. зьявіцца ў ЦП (Дом Працы, пакой № 13), не пазьней 9-IV ад 13 да 16 гадзіне дню.

Не зьявіўшыеся ў паказаны тэрмін будуць зьняты з вучоту і мэханічна выбываюць з саюзу.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Пры Вячэрнім Пэдфаку
— **адкрываецца** —
Дадаткова літаратурна-лінгвістычнае аддзяленьне.
Прыём заяў да 20 красавіка 1931 г.
Дэкан пэдфаку РУДНІЦКІ.

Нарсуд Чарэйскага раёну, згодна свайго прысуду ад 13-га лютага 1931 г., на падставе 213 арт. КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне старшыні Чарэйскага спаж. т-ва Левертаву Саламону Давідаву, былшаму старшыні калгасу «Колас» Чарэйскага раёну Рубінаву Лазару Еселеву, загадчыку гасчасьці калгасу «Колас» Пушнову Сьцяпану Герасімаву і старшыні Райкаапленсаюзу Чарэйскага раёну Савіцкаму Станіславу Францаву, за тое, што яны нядбайна адносіліся да захаваньня канапель у складах.

Нарсуд Любаньскага раёну, на падставе свайго прысуду ад 22-га лютага 1931 г. за дрэнныя адносіны да працы, якія выразіліся ў непрыняцьці сваячасовых мер да загатоўкі і адгрузкі капусты, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне старшыні Любаньскага Райкаапсаюзу Аўсянікаву Марку Зьмітраву.

Друкарня імя тав. СТАЛІНА.

Галоўлітбел № 598.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4 V2